Божым шляхам

Год XXIII № 1-2 (143-144)
1975

ПАДПІСКА »БОЖЫМ ШЛЯХАМ« НА 1975 г.:

У Задзіночаных Штатах Амэрыкі — 3 даляры.
У Вялікабрытаніі — £ 1-00.
У іншых краінах у суме раўнаважнай £ 1-00.

ЧАСАПІС МОЖНА ЗАКАЗЫВАЦЬ:

У Задзіночаных Штатах:

Mr. Antony Bielenis, 3006 Logan Blvd, Chicago, Ill. 60647, USA.
Mr. B. Danilovich, 303 Hovard Str., New Brunswik, New Jersey, USA.
Mr. Ch. Najdziuk, 833 N. Coronado Str., Los Angeles, Calif., USA.
Mrs. J. Kachanovska, 8 St. Mark's Pl., New York, N. Y., USA.

У Канадзе:

Mr. Pituška, 116 Grand Ave., Toronto, Ont. 560, Canada.

Матар'ялы прызначаныя да друку ў нашым часапісе слаць на адрас:

Rev. F. Žurnia, MARIAN HOUSE,
HOLDEN AVENUE, LONDON, N12 8HY.,
Gt. Britain.

УВАГА: Адрас просім пісаць з усімі знакамі — N 12, азначае North, а не нумар.

ON GOD'S HIGHWAY

Year XXIII **№ 1-2 (143-144)**
1975

MARIAN HOUSE, HOLDEN AVENUE,
LONDON N12 8HY.,
GREAT BRITAIN.

БОЖЫМ ШЛЯХАМ

ГОД XXIII — № 1-2 (143-144)



Малітва да Найсьвятой Дзевы Марыі:

— старой Піліпіхі і
— беларускага пісьменьніка.

— Царыца нябесная . . .

Узьвідзь мяне старую Піліпіху з Малых Лядаў. З адхутаным сэрцам стаю я цяпер перад Табой. Даруй, што прыйшла да цябе у адзенейку латаным, ды у абуцейку стаптаным. Уцякачка я — віцебская. Няма у мяне, Прачыстая, ні сям'і, ні хаты . . . Адна-ж я засталася, як тая бяроза прыдарожная, пяруном падбітая . . . Піліп мой яшчэ за царскую вайну загінуў у тых Карпатах. І няма ведама, дзе ягоная магіла, і ніхто над ёю не галасіў. Успамяні, Матка Божая, жаўнера Піліпа за званамі галоснымі, за сьвячамі яснымі. А бальшуна майго бальшавікі расстралялі у тым Вяліжы, на тым Пакроўскім полі... Добры хлапец быў і закатавалі яго . . . Можа у тэй рэчцы вады менш цячэ, чым сьлёз я па ім выплакала . . . Успамяні, Матка Божая, Міхалку майго неўгамаванага. Супакой яго пакутніка, у царсцьве нябесным . . . А малодшы мой у арміі. Забралі яго у другую мабілізацыю. Адвядзі ад яго, Прачыстая, кулі сьмяротныя . . . Паздароў, Матка Божая, Касьцюка. Лепш мяне прыбяры, толькі няхай ён жыве . . .

Бабка Піліпіха схіляецца да падлогі. Плечы ейныя дрыжаць.

І тады зьвяртаюся да Божае Маці я — сьціплы беларускі пісьменьнік:

— Найсьвяцейшая Багародзіца-Дзева, абарані радзіму нашу Беларусь і зьнішч ейных ворагаў. Ахутай сваей ласкай усіх шчырых беларусаў — і праваслаўных, і каталікоў, і вуніятаў, і тых, што не знайшлі яшчэ дарогі да Бога.

Я, нязначны, прашу ў Цябе, Найясьнейшая Дзева, штодзённага натхненьня і крыху хлеба. Дапамажы мне зноў пабачыць роднае і любае Надзьвіньне. А калі давядзецца загінуць у змаганьні за шчасьце і волю майго беларускага народу, папрасі, Прасьвятая Багамаці, у Сына Свайго дараваньня грахоў маіх. Амін.

(Юрка Віцьбіч, »Пад Тваю міласьць прыбягаем, Багародзіца Дзева«. Абраз Божае Маці Менскае. Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі, 1947, Нр. 7, с. 4-5. Тое самае ў крыху зьмененай рэдакцыі: Нацыянальныя сьвятыні. Мастацкія нарысы. Бэрлін, 1944, с. 30-31.)

ЮРКА ВІЦЬБІЧ

4 студня 1975 г. адыйшоў у лепшае жыцьцё Юры Стукаліч, выдатны беларускі пісьменьнік, гарачы патрыёт, вораг камуністычнай ідэалёгіі і марксістоўскага ладу, глыбока веруючы хрысьціянін, які звычайна пісаў пад прозьвішчам Віцьбіч, радзей Алесь Крыжаніч.

Юрка Віцьбіч нарадзіўся ў Веліжы на Віцебшчыне (цяпер навонкі межаў БССР) 2 чэрвеня (ст. ст.) 1905 г. ў сям'і зь дзеда прадзеда сьвятарскай. Вось вестка перададзеная самым пісьменнікам аб ягоным прапрадзеду: »Будучи сыном и внуком православных священников, замученых большевиками, я не в состоянии никогда забыть, что мой прадед — униатский священник, умер одиноким и слепым в ссылке, в Саравском монастыре Темниковского уезда, Тамбовской губернии. Это личное — капля в море страданий белорусского народа...«[1]) Дзед нашага пісьменніка праваслаўны сьвятар а. Алімп Гаворскі быў сучасьнікам а. Міхаіла Красавіцкага, ведамага ізь любві да старадаўніх беларускіх помнікаў, аб якіх пісаў у розных расейскіх часапісах.[2]) Дачка а. Алімпа Гаворскага была замужам за Іванам Паповым, праваслаўным сьвятаром. Ягоная дачка Эўдакія вышла замуж за Аляксандра Стукаліча, каторы таксама быў праваслаўным сьвятаром і ў іх сям'і 2 чэрвеня паводле ст. ст. 1905 г. прыйшоў на сьвет Юрка, які пазьней назаве сябе Віцьбіч, імя ўзятае ад ракі Віцьбы, прытоку Дзьвіны, ад якой і горад Віцябск.

Як бачым чатыры пакаленьні (па лініі маткі) роду Стукалічаў належалі да сьвятарскага стану, таму можна яго назваць родам беларускіх левітаў.

Плодны пісьменьнік Віцьбіч быў скупы, калі гэта датычыла яго асобы або яго сям'і. Усёжтакі аб сваей маці ён крыху напісаў з нагоды яе сьмерці у »Царкоўным Сьветачы«.[3] Радзілася яна 23 лютага 1877 г. ў Полацку ў сям'і а. Івана Папова, абсальвэнта Духоўнае Акадэміі. Памерла ў 1971 г. ў Злучаных Штатах Амэрыкі на 95-м годзе жыцьця.

Жыцьцё маці кідае шмат сьвятла на асобу і на жыцьцёвы шлях яе сына, таму варта нам пацікавіцца і Еўдакіяй Стукаліч. Пасловіца кажа: якое дрэва — такі зь яго клін, якая матка — такі і сын.

Еўдакія »скончыўшы выдатна віцебскае епархіяльнае жаночае вучылішча, шмат год яна працуе настаўніцай ў вялікай жаноцкай гімназіі. На долю нябошчыцы выпала перажыць некалька войнаў, рэвалюцыю, а таксама усе тыя перасьледаваньні, якія чыніла бязбожная бальшавіцкая ўлада, акупаваўшы Беларусь«.[4]) Еўдакія Стукаліч таксама перажыла »бязбожную пяцігодку, абвешчаную дэкрэтам 1 травеня 1932 г., у часе якой злачыннай бальшавіцкай рукой расстраляна, замучана, зажыва спалена ці утоплена соткі япіскапаў, тысячы сьвятароў, мільёны ў Бога веручых людзей. Турма, канцлягер і перасьледаваньне — вось той шлях, якім ішло духавентва, жывучы ў Савецкім Саюзе...«[5]) Духавенства было пазбаўлена выбарчага права, а таму іх сем'і былі пазбаўлены права на прадуктовыя карткі, пазбаўленыя на працу і на школу, мэдыцынскую дапамогу і на права да кватэры.

»Духавенства цесьніцца ў знаёмых, родных, цэлымі сем'ямі ў кутках, на карыдорах, ды часам і гэтай магчымасьці ня мае, бо ад духоўніка ў Савецкім Саюзе ўцякаюць, пазбягаюць яго, дзеля страху перад уладай... А таму шмат давялося перажыць гора і нябожчыцы, падзяляючы ўсе жахі перасьледаваньня з **сынамі** і мужам Аляксандрам, які ня раз арыштоўваўся за сваё сьвятарства, пакуль сьмерць ня выратавала яго ад непазбежнай ссылкі ў канцлягер...«

»Сьв. п. матушка Еўдакія Стукаліч была высокай эрудыцыі, як матушка, як настаўніца, як мастачка і ў той самы час была вельмі сьціплай, лагоднай, ціхай у абыходжаньні з людзьмі, ніколі не выстаўляючы сваіх ведаў і заслут перад людзьмі«.[6])

---

1) Юрий Стукалич, О белоруссах в кавычках и без кавычек. Новое Русское Слово, 25 января 1955, Нр. 15613, с. 2-3.

2) П. Красавицкий, Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их охранение. Полоцко-Витебская Старина, Витебск, 1911, кн. 1, с. 1-64. — Гэты самы артыкул у скароце ў беларускім перакладзе быў надрукаваны ў Божым Шляхам, 1956, Нр. 70-75, с. 7-28. Там-жа і крыху вестак аб а. Красавіцкім. — Ліст Ю. Віцьбіча да а. Арх. Л. Гарошкі з дня 5 студня 1958 г. Архіў ББ імя Ф. Скарыны ў Лёндане.

3) Нр. 1(20), 1971, с. 28-30.

4) Там-жа, с. 28.

5) Там-жа, с. 28.

6) Там-жа, с. 29.

Такое прыгожае сьведчаньне пакінуў добры сын Юры аб сваей маці Еўдакіі. Усё тут сказанае пра маці у роўнай меры адносіцца і да сына, ці дакладней — да сыноў. Няма сумніву, што Юрка мусіў жыць і здабываць асьвету у вельмі неспрыяльных абставінах. Таму выкарыстоўвываў веды сваіх бацькоў, высокую эрудыцыю сваей маці, сваю ўласную кніжніцу (гэтак ён называе бібліятэку), якая мусіла быць значнай гэтак задаўненай сьвятарскай сям'і.

Аб пару здарэньнях з часаў свайго дзяцінства Юрка Віцьбіч сам расказвае ў лісьце да а. Архімандрыта Л. Гарошкі.[7])

Будучы васьмігадовым хлапчуком адведаў ён разам са сваім бацькам мужчынскі манастыр на рацэ Мяжы, у якім мелася найвялікшая сьвятыня Вокаўскага Лесу: цудатворная ікона Ардынскае Божае Мнці (копія Уладзімірскія). Каб памаліцца перад той іконай, сходзіліся масы народу. Часамі гэту самую ікону абвозілі па вёсках і мястэчках. Пабывала яна таксама і ў хаце сьвятара Стукаліча ў Вяліжы. Магчыма з тых дзён пачынаецца ў душы Юркі разгарацца асаблівая любоў да іконаў Багародзіцы і глыбокая да Яе пабожнасьць. Ён сам склаў некалькі малітваў да Найсьвятой Дзевы Марыі.

У 1919 г. Юрка Стукаліч вучыцца у 5-ай школе другой ступені ў Веліжы, дзе яго настаўнікам ёсьць Міхаіл Навіцкі, пазьнейшы пратаерэй Беларускай Аўтакафальнай Царквы, закатаваны пазьней бальшавікамі за подпіс, які злажыў у 1924 г. разам з Мітрапалітам Мэльхізэдэхам, які ў тым часе арганізаваў БАПЦ.

Што а. Навіцкі быў беларускі патрыёт і што агнём свайго пачуцьця мог запаліць іншых, сведчыць наступны факт самым Віцьбічом памастацку пераказаны.

»Аднойчы Навіцкі прыходзіць на лекцыю надзвычай усхваляваны і, разгарнуўшы апошні нумар »Праўды«, голасна чытае:

Демьян Бедный:

Янкин голос соловьиный
Превратился в шип змеиный
Да, в змеиный
Да, в змеиный.

І чытаючы Навіцкі добрасумленна стараецца данесьці да нас і падкрэсьліць усю нянавісьць крэмлёўскага прыдворнага пісакі да нашага роднага паэты. З паўхвіліны ён маўчыць і раптам, узьняўшы да гары руку, з вялізным натхненьнем чытае:

На сход, на усёнародны, грозны, бурны сход
Ідзі аграблены, закованы народ!

Навіцкі чытае з такім пачуцьцём, што твар ягоны стаўся белым, але голас не згубіў моцы:

Як Бацькаўшчыну тваю рэжуць на кускі,
Як гібнеш з дзецьмі ты ад катняе рукі —
Аддаці ўсё на суд, на ўсёнародны сход,
Ідзі, аграблены, закованы народ!

Навіцкі закрыў далонямі твар і хутка выйшаў, амаль выбег з клясы. Шмат разоў пазьней чуў я, як чыталі »На сход« Янкі Кпуалы, але ніколі ён не прагучэў для мяне з такой сілай, як тады ў 1919 годзе, у старадаўнім беларускім Вяліжы, што сьцякаў крывёю, змагаючыся з расейскім бальшавізмам«.[8]

Тут мы жадалі-б паставіць адно важнае пытаньне: ці той дзень і тое натхнёнае чытаньне палымянага твору Янкі Купалы настаўнікам Навіцкім ня ёсьць пачаткам нікім і ніколі нязломанага патрыятызму Юркі Стукаліча-Віцьбіча?

*

Пасьля заканчэньня тэхнікуму астацца настаўнікам нашаму пісьменніку не дазволілі дзеля »сацыяльна чуждага паходжаньня«. Выяжджае ён тады у Маскву і там праз 10 гадоў працуе на хэмічных заводах, каб здабыць права на вышэйшую асьвету.[9]) Аднак і там спатыкае яго няўдача: на вайсковым заводзе у час аварыі ён атруціўся фасгэнам і стаўся няздатным да працы. Вяртаецца на Беларусь і ў далейшым здабывае асьвету саматугам. Зь яго пазьнейшых твораў можна судзіць аб яго зацікаўленьнях і студыях у розных галінах веды, а перадусім у такіх як літаратура, архэалёгія, этнаграфія, фальклёр, гісторыя мастацтва і гісторыя наагул.

У верасьні 1939 г. бачым яго на чале навуковае экспэдыцыі па дасьледваньню помнікаў рэвалюцыі, гісторыі і мастацтва ў Воршы. Тады ўлез ён і ў аршанскую пячору, якая знаходзіцца на калішніх землях Кутеінскага манастыра, а якую дасьледвалі перш у 1926 г. Сербаў, Даўгяла і Аніхоўскі.[10])

7) Ліст з дня 5 студня 1958 г. Архіў ББ імя Ф. Скарыны ў Лёндане.

8) Завулак імя Янкі Купалы. Шыпшына, 1950, Нр. 9, с. 40-41. Таксама ў »Бацькаўшчыне«, 29 чэрвеня 1952, Нр. 25-26 (104-105).

9) М. Караневіч, Пройдзеным шляхам, Беларус, ліпень 1965, Нр. 100, с. 3. Станіслаў Станкевіч, 40 год літаратурнай дзейнасьці Юркі Віцьбіча, Беларус, 1969, Нр. 151, с. 3.

10) Ю. Віцьбіч, »Кепска каля Віцебска, а ла Воршы 'шчэ горшы«. Бацькаўчына, 1956, Нр. 42 (324), 43 (325). Д. І. Даўгяла, Аршанскія пячоры, Наш Край, 1926, Нр. 8-9 (11-12), с. 45-50.

У тым самым часе едзе ён у Крошын, дзе адшукаў магілу паэты Паўлюка Бахрыма. Аглядаў жырандаль у каталіцкім касьцеле, які Бахрым выкуў у сваей собскай кузьні і падарыў туды. Віцьбіч першы усталіў дату сьмерці Бахрыма: 1891, што за ім паўтарыў Язэп Найдзюк у сваей гісторыі, а пасьля савецкі дасьледчык Бас.[11])

У студзені 1941 г. Віцьбіч трапляе у НКВД-эшную катавальню за тое, што ўхітрыўся паставіць помнік на магілах вялiскіх паўстанцаў. Пра гэта паўстаньне ён пазьней надрукуе ў »Бацькаўшчыне« прыгожы нарыс.[12])

У час вайны Віцьбіч разам з маці і жонкай трапляе ў Нямеччыну. Перад ейнай капітуляцыяй працуе пад камандай нямецкага баура, які пасылаў яго двойчы з вёскі Лібвальдэ капаць супроцьтанкавыя ірвы пад возерам Шпірдынг. У выніку цяжкой працы наш пісьменьнік »ператварыўся ў жывога касьцяка«. У 1945 г. знаходзіцца у вёсцы Эмеркінген паблізу гораду Эгінгэну (Вюртэмбэрг).[13])

Новая эпоха пачалася для сьвету, а таксама і для беларускіх уцекачоў, калі Нямеччына ў пух разьбітая здала аружжа. Не значыць аднак, што гора людзкое — асабліва уцекачоў — скончылася. Для гэтых пачаўся г. зв. дэпісаўскі пэрыяд, — людзей бяз хаты і месца, якія будуць праходзіць розныя скрынінгі, каб толькі выехаць кудысьці ў вольны сьвет, абы далей ад бальшавікоў, каторыя ніяк не марнуюць часу, каб вылавіць большыя рыбы і вывезьці іх падманам ці сіламоц на »родіну« . . . Паўстаюць у розных зонах акупацыйных Нямеччыны ДП лагеры. Жыцьцё-быцьцё ў іх беларускай палітычнай эміграцыі чакае яшчэ на свайго сумленнага гісторыка, хаця ўжо і тут зроблены даволі добры пачатак. Маю на ўвазе працу сьв. п. Аляксандра Вініцкага: »Матар'ялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне ў 1939-1951 гадох«, Лос Анджэлес 1968, ч. I-III. Названы пэрыяд мае для нас вялікае значэньне, бо ў Нямеччыне, якая ляжала ў друзах, тысячы нашых суродзічаў: сяляне, былыя урадоўцы і жаўнеры, настаўнікі, духавенства, паэты і пісьменнікі — усе яны знайшлі ня толькі змогу ўцекі ад бальшавіцкай навалы, але маглі наладжываць сваё ўласнае грамадзкае, культурнае і рэлігійнае жыцьцё. Паўстала шмат розных арганізацыяў, а разам зь імі ажывіўся і беларускі друк, няхай-сабе на дрэненькай паперы і адбіты на ратататары.

Панькоў, які першы зрабіў спіс беларускай пэрыёдыкі за гады 1945-50 падае больш чымся 40 назоваў, сярод якіх некаторыя замест добрых вестак і пашырэньня веды, разносілі па лягерах, а пасьля і навонкі іх сваркі і грызьню беларусаў між сабой. Але былі і такія, што й да сяньня маюць сваю цану. Гэтага роду выданьні засьведчылі нятолькі аб беларускай апрычонасьці, але аб жывучасьці яе культуры. Да такога роду часапісаў належыць »Шыпшына«, літаратурна-мастацкі часапіс, орган літературнага аб'еднання той самай назвы. Выходзіў ён у гадох 1946-50, зьявілася ўсіх толькі 9 нумараў. Да той самай катэгорыі салідных часапісаў трэба ўлічыць і »Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі«, які выдаваўся ў гадох 1946-47 і выйшла яго толькі 8 нумараў. Абодвых гэтых часапісаў рэдактарам і душой быў Юрка Віцьбіч.

Калі некаторыя беларусы пачалі сароміцца ратататарнага друку, дык Віцьбіч уважаў, што ён ёсьць вялікім дасягненьнем у параўнаньні з савецкай рэчаіснасьцю, дзе няма свабоды для вольнага слова. І падаў да агульнага ведама такі факт: » . . . Але адначасна прыгадваюцца латы на кажуху савецкага катаржніка Ўладзіміра Хадыкі, пад якія ён зашываў свае новыя вершы. Не забывайма ніколі пра гэтыя латы!«[14])

Згуртаваньне »Шыпшына« паўстала ў адным з лягераў ДП на ўскраіне Рэгэнсбурга 9 красавіка 1946 г. Яе закладчыкамі былі Віцьбіч, Арсеньнева, Золак (Даніловіч) і Сяднёў. Хутка яно згуртавала блізу ўсіх паэтаў і пісьменнікаў на эміграцыі. Галінка шыпшыны з кветкамі і калючкамі стала сымбалям-эмблемай згуртаваньня, а ведамы верш узвышанца Уладзіміра Дубоўкі »О, Беларусь, мая шыпшына« паэтычным маніфэстам.

У дэклярацыі беларускага літаратурнага Згуртаваньня »Шыпшына«, якую падпісалі 12 паэтаў і пісьменьнікаў (Арсеньнева, Віцьбіч, Вярба, Золак, Іллящэвіч, Кавалеўскі, Клішэвіч, Салавей, Сяднёў, Сядура і Чэс-

---

11) Ю. Віцьбіч, Бахрым ці Багрым. Бацькаўшчына, 1955, Нр. 35 (265).

12) Кат. Каляды 1958, Нр. 49-50 (435-36). Гл. таксама: »Урачыста панясём цымбалы многазвучныя«, Бацькаўшчына, 1956, Нр. 303.

13) »Урачыста панясём цымбалы многазвучныя«, гл. папярэднюю зноску. — Цяжкую працу сваю і сваіх сяброў апісаў Віцьбіч у мастацкім нарысе: »Над возерам Шпірдынг« надрукаваным у: Ля чужых берагоў. Альманах твораў беларускіх эміграцыйных паэтаў і пісьменьнікаў, Мюнхэн, 1955, с. 189-192.

14) Што нам патрэбна. Бацькаўшчына, 1953, Нр. 159, с. 3.

лаўскі) аб яго шляхотных і высокіх мэтах было сказана:

1) Згуртаваць беларускіх актыўных і творча-дасьпелых пісьменьнікаў-бэлетрыстых, паэтаў, драматургаў і крытыкаў, што знаходзяцца на эміграцыі;

2) Працаваць над стварэньнем вялікай літаратуры, годнай нашага вялікага народу.

У той самай дэклярацыі далей чытаем вельмі характэрнае паясьненьне як для Віцьбіча так і для маладой ім створанай арганізацыі: »ШЫПШЫНА стаіць на варце поўнае свабоды творчых пошукаў, але для ейных сяброў зьяўляецца абавязковым крытэры высокае мастацкасьці літаратурнага твору, імкненьне да ідэёвае *насычанасьці і арыгінальнасьці,* глыбокая пашана да нашае літаратурнае спадчыны і пачуцьцё да спадкаемства да ўсяго лепшага ў ёй, ўзаемная пашана да творчасьці адзін другога, а ў галіне ідэёвай — самаахвярная адданасьць найвышэйшаму Ідэалу нашага Народу«.[15])



У творах Віцьбіча усё тут выказанае мы знаходзім: ідэёвую насычанасьць, арыгінальнасьць і адданасьць найвышэйшаму ідэалу нашага народу — гэта значыць яго вольнасьці, незалежнасьці і дабрабыту.

Ўсяго чатырох чалавек прыгатаўляла глебу пад »Шыпшыну«, яе дэклярацыю падпісала 12 пісьменьнікаў, а друкавала свае творы ў часапісе больш 30 аўтараў,[16]) ня лічучы аўтараў іншых нацыянальнасьцяў. Апрача таго друкаваліся ў »Шыпшыне« творы 34 беларускіх пісьменьнікаў, якія жылі ў Беларусі або й цяпер там жывуць і твораць. Цікавая рэч, але на бачынках »Шыпшыны« мы не знаходзім ані аднаго твору Купалы, Коласа, Цёткі і іншых нашых клясыкаў, хаця ў артыкулах прыгадывалася і іхнія імёны. Гэта добра сьведчыць аб вылучнай сьпеласьці часапісу і яе рэдактара: Юрка Віцьбіч і ягоныя сябры па пяру за-добра ведалі творы нашых клясыкаў, каб іх перадрукоўваць і запаўняць імі тую цяжка прыдбаную паперу. Таму друкаваліся ў »Шыпшыне« або зусім арыгінальныя творы, або мала ведамыя пераважна бальшавікамі закатаваных пісьменьнікаў.

Калі ўжо мелі сваю арганізацыю і свой часапіс пісьменьнікі і літаратурныя крытыкі, тады насьпела патрэба згуртаваць таксама актараў, маляроў, кампазытараў, скульптараў, мастацтвазнаўцаў, сьпевакоў, працаўнікоў народнага й іншых мастацтваў. Такога роду аб'еднаньне мела свой назоў: »Беларускі Фронт Літаратуры і Мастацтва«, а яго заданьнем было: а) усёбаковая і сталая дапамога працаўнікам мастацтва ў іхняй творчай працы; б) захаваньне мастацкіх кадраў у часе далейшай эміграцыі і непазьбежнага зь ей расьцярушаньня.

Хаця ўжо ў палове 1946 г. была гутарка аб »Беларускім Фронце Літаратуры і Мастацтва«, зварот да мастакоў, каб іменна яго стварыць, быў падпісаны Усеваладам Качанскім, Юркам Віцьбічом і Мікалаем Кругловічам толькі 1 лютага 1949 г., а надрукаваны ў »Беларускім Слове«, дня 5 лютага 1949 г.[17]) Быў гэта апошні нумар газэты рэдактара Ю. Віцьбіча.

Нажаль, Беларускі Фронт Літаратуры і Мастацтва ня змог праявіць большай дзейнасьці, бо-ж і арганізацыі з пэўнай ужо прошласьцю, паволі ўміралі як прыкладам »Шыпшына«, каторай орган № 9 і апошні (той самай назвы) вышаў у 1950 г. Калі арганізатары згуртаваньня і супрацоўнікі разьехаліся па ўсіх кутках сьвету, некаторыя зь іх заціхлі на заўсёды, іншыя адыйшлі ў вечнасьць, а згуртаваньне Шыпшина самособой ліквідавалася. Нядаўняя сьмерць яго

[15]) Шыпшына, 1946, Нр. 2, с. 45.

[16]) З эміграцыйных паэтаў і пісьменьнікаў: Арсеньнева, Віцьбіч, Сяднёў, Алесь Салавей, Клішэвіч, Юстапчык, Лявон Случчанін (Шпакоўскі), Золак (Даніловіч А.), Р. Крушына, Кавыль (Лешчэнка), Брага, Дудзіцкі, Залужны і інш.

[17]) Беларускае Слова, 5 лютага 1949, Нр. 3 (4).

закладчыка Юркі Віцьбіча ліквідацыю тольскі прыпячатала.

*

Блізу ў тым самым часе, што і »Шыпшына« выходзіў рэлігійны часапіс пад арыгінальным прыгожым назовам: »Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі«, якога радактарам таксама быў Ю. Віцьбіч. У гадох 1946-1974 існавала 12 праваслаўных беларускіх часапісаў рознай пэрыядычнасьці. Сярод усіх іх без сумніву найлепш рэдагаваным быў »Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі«. Належную яго ацэнку падаў У. Глыбінны: »Ужо пры першым азнаямленьні з зьместам часапісаў »Зьв. Зв. Сьв. Сафіі«, якіх мы ў часе пісаньня гэтай рэцэнзіі маем тры нумары, пераконваешся, што гэта паважны, вельмі зьмястоўны і надта патрэбны беларускаму грамадзтву часапіс. І хаця-ж на вокладцы зазначана, што гэта часапіс праваслаўных беларусаў, аднак ягоны сур'ёзны беларускі зьмест, наяўнасьць, побач з матар'яламі рэлігійнага зьместу, багатых матар'ялаў з гісторыі нашай Бацькаўшчыны, літаратурна-мастацкіх і грамадзкіх матар'ялаў, датрыманых цалкам у дусе выразнага і пасьлядоўнага нацыянальнага выхаваньня, робіць гэты часапіс агульна-беларускім, каштоўным кожнаму беларусу бяз розьніцы веравызнаньня«.[18])

У часапісе »Зв. Зв. Сьв. Сафіі« знаходзім апрача артыкулаў рэлігійнага зьместу цікавы падбор вершаў нашых паэтаў, у якіх як у люстры адбіваецца іхняя вера ў Бога і вера нашага народу. Шмат падаецца вестак з жыцьця Бел. Прав. Царквы, добра абдуманы каляндар са сьвятымі дня і хрысьціянскіх учачыстасьцяў. Гэты часапіс ёсьць вельмі важным як адна з жывых крыніцаў для устанаўленьня агульнай беларускай царкоўнай тэрміналёгіі, якая дагэтуль мае непрыемны рознабой у праваслаўных і каталікоў.

Часапіс гэты заняў вельмі выразную і суровую пазыцыю супроць Уладыкаў, якія перш на Бацькаўшчыне арганізавалі БАПЦ, а пасьля яе адракліся і ўліліся ў Расейскую Зарубежную Царкву. Адносна берасьцейскай вуніі і сьв. Ёзафата Кунцэвіча маемо цьвёрдыя сказы самога рэдактара, а перадусім іншых (а. Лапіцкага). Варта аднак заўважыць, што ў найбольш ярым сваім артыкуле: »Можна зьнішчыць звон, але нельга зьнішчыць народ« Віцьбіч меў адвагу напісаць: »Крывёю гэрояў народнага паўстаньня 1623 году паліта тое месца, на якім знаходзіцца цяпер у Віцебску маленькі сквэр. Можа прыйдзе той час, калі тут будзе пастаўлены высокі гранітавы абеліск. *А сёньня, каб зьдзейсьніць найлепшыя ідэалы нашае Маці-Беларусі, нам, незалежна ад нашых веравызнаньняў, патрэбны фанатызм і Навума Воўка і Ёзафата Кунцевіча«.*[19]) (Падкрэсьленьне маё А. Д-ка).

Варта тут таксама ўспомніць асаблівую пашану Віцьбіча да апошняга вуніяцкага Мітрапаліта Ёзафата Булгака († 1838), якому прысьвяціў адзін з найлепшых сваіх эсэяў,[20]) я ягоную пячатку зьбярог і перадаў у Беларускі Музэй імя Францішка Скарыны ў Лёндане.

У тым самым часе напружанай літаратурнай дзейнасьці, калі ён рэдагаваў літаратурны і рэлігійны часапісы, упрогся (ці можа яго ўпраглі) і ў рэдактарства »Беларускага Слова«, палітычнай газэты, якой першы нумар выйшаў 17. 12. 1948 г. У наступным годзе пад рэдакцыяй Віцьвіча выйшлі яшчэ

---

18) У. Глыбінны, Ня згаснуць іскры Скарыны, Шыпшына, 1946, Нр. 2, с. 41.

19) Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі, 1946, Нр. 3, с. 14. Тут варта заўважыць, што ў кніжыцы Ю. Віцьбіча, Нацыянальныя сьвятыні. Мастацкія нарысы, Бэрлін, 1944, с. 10-11, у нарысе: »Можна зьнішчыць звон, але нельга зьнішчыць народ« зусім няма апошняга сказу: »А сёньня, каб зьдзейсьніць ідэалы нашае Маці-Беларусі ... Кунцэвіча«. Напрашваецца высnаў: або гэтага абзацу не было ў тэксьце, якім карысталася рэдакцыя, або дзеля нейкіх прычын рэдакцыя яго выкінула. Таму дарэчы зацемка ва ўступе да зборніка, што ён »складзены без аўтаравага удзелу«. Падобны сказ аднак знаходзім у нарысе »Узарванае барока«, тамжа с. 25.

20) Паданьне аб таямнічым сьвятле. Бацькаўшчына, 3 ліст. 1951, Нр. 15-16 (94-95), с. 2. У лісьце да а. Архімандрыта Л. Гарошкі з дня 23.XI.1951 г. Віцьбіч пісаў: »Адначасна дасылаю Вам маленькую імпрэсію ці абразок »Паданьне аб таямнічым сьвятле«, якое разам з іншымі маімі творамі ідзе ў чарговы Нр. 10 час. »Шыпшыны«. Мяне вельмі цікавіць Ваш погляд на гэты мой твор. Хаця я вельмі старэнна апрацоўваў яго, але ўсё-ж магчымы памылкі, як з гістарычнага гэтак і з рэлігійнага пункту гледжаньня. Калісьці я пісаў пра аднаго Ёзафата, а цяпер пра другога. Між іншым у маім асабістым архіве ёсьць сургучовы адбітак з пячаткі Архіяпіскапа Ёзафата Булгака, ёсьць таксама малюнкі віцебскае катэдры да Савы Ціхаміра ва і пасьля яго. Калісьці ў маём бібліятэцы былі 9-ці тамовыя »Запіскі Архіяпіскапа Харкаўскага Саввы«. 4 том прысьвечаны ягонаму архіпастырству на Віцебшчыне і варта пазнаёміцца з ім, каб пераканацца што ён зьяўляецца зацятым расейскім цемрашалам. Нібы змагаючыся за чысьціню праваслаўя ў вогуле, ён змагаўся з сваеасаблівымі адзнакамі беларускага праваслаўя, падмяняючы яго расейскімі адзнакамі... У маёй сям'і захаваўся ўспамін, як мой прадзед сьвятар хаваў ад Савы, у часе ягонае паездкі па эпархіі, статую Збавіцеля, перад якой са сьлязьмі на вачох маліліся беларусы ўсіх веравызнаньняў і якую Савга разам з усімі статуямі хацеў зьнішчыць«. — Дадаём заўвагу, што 10-ты нумар »Шыпшыны« ня выйшаў і таму аўтар надрукаваў свой абразок ў »Батькаўшчыне«.

тры нумары, а ўжо ад нумару пятага (1950) заступае яго Александра Русак.

Быў гэта магчыма найбольш цёмны і сумны час у жыцьці беларускай эміграцыі. Сваркі ўсялякага роду — палітычныя, рэлігійныя, ненавісьць і даносы множыліся як тыя бацылы заразнай хваробы. Вынік пэўна-ж перамучаньня людзей цярпенямі вайны і жыцьцём у лягерах. Нажаль, тыя бацылы хутка перанесьліся і за мора-акіяны, куды паволі траплялі нашыя суродзічы.

Віцьбіч унікаў палітыкі, хаця можа меў і рацыю Алесь Салавей, калі быццам мімаходам заўважыў: »... хоць Віцьбіч, думаецца мне ня горшы палітык за тых, хто прэтэндуе на палітыка«.[21]) Крыху пазьней, бо 31 траўня 1954 г. сам Віцьбіч аб гэтым пісаў да А. Змагара: »Вам пэўне-ж вядома, што калісьці я належыў да Калегіі БЦР і дабраахвотна (без усялякага ціску з таго ці іншага боку) спакінуў яе. Проста я прышоў да выснаву, што непараўнальна больш зраблю для нашага вызвольнага руху, як пісьменьнік, навуковец, журналісты. Няхай палітыкі займаюцца палітыкай«.[22]) Віцьбіч быў паслядоўным: мы ня знаем ніякай партыі ці групоўкі, зь якой ён быўбы зьвязаны ці падпарадкаваны ейным лёзунгам. Наадварот — свае літаратурныя творы пасылаў ва ўсе паважнейшыя эміграцыйныя часапісы і газэты. Такім чынам ён споўніў ролю лучніка між беларусамі як чалавек, як хрысьціянін, як беларускі патрыёт.

*

Пасьля ўсяго таго, што мы тут сказалі аб жыцьці, пяройдзем цяпер да ня менш важнага — да спадчыны пісьменьніка. Ніхто яе і нідзе яшчэ ня пробаваў падсумоўваць. Можна было-б аднак зарызыкаваць сьцьверджаньне, што ўсе творы Віцьбіча датэтуль апублікаваныя, каб сабраць іх ў аднатомікі падобнай вялічыні, якімі цяпер у БССР выдаюцца Купала і Колас, склалі-б добрых 8-9 тамоў, пакідаючы пры тым навонкі вельмі-ж багатую і цікавую карэспандэнцыю, радыёперадачы.

Першае апавяданьне Віцьбіча: »Як загінуў Ясь« было надрукавана ў часопісе »Узвышша« (Нр. 9-10, 1929). Гісторыя яго вельмі характэрная для тагочасных умоваў. Перш паслаў яго аўтар у літаратурны дадатак »Савецкай Беларусі«, у якім у рубрыцы »паштовая скрынка« зьявіўся наступны адказ М. Чарота: »Вашае апавяданьне »Як загінуў Ясь«, дарэчы напісана вельмі добра, друкавацца ня будзе, бо ў ім слаба адбіліся клясавыя супярэчнасьці на вёсцы«. Тады Віцьбіч паслаў манускрыпт у часапіс »Узвышша«. Белліта зьмяняе назоў на »Млынарова рука«, але апавяданьне надрукавана. Пасля аўтар яго атрымаў прачулы ліст ад Кузьмы Чорнага і гэты »па сутнасьці зьяўляўся дыплёмам на годнасьць пісьменьніка«. Здольнасьці Віцьбіча падобна адзначылі Дубоўка і Язэп Пушка.[23])

У далейшым творы нашага аўтара паяўляюцца ў розных часапісах у БССР, як »Узвышша«, »Полымя Рэвалюцыі«, »Маладняк«. Аповесьць »Ціхая Руба« пачала друкавацца ў »Полымя Рэвалюцыі« ў 1932 г. Асобнымі кніжкамі вышлі: »Сьмерць Ірмы Лаймінг« (1932); »Формула супраціўленьня касьцей« (1937) і на эміграцыі: »Плыве з-пад сьвятой гары Нёман«, ч. I, 1956 г. »Як езьдзіў у Конга пан Прун'е« забраў сам аўтар з Белдзяржвыдавецтва, бо не пагадзіўся з рэцэнзіяй ейнага рэдактара. Повесьць »Лшона габоа Бійрушалайм« (У наступным годзе ў Ярузаліме) друкавалася ў »Полымя Рэвалюцыі« (1932), а яе урывак: »Як сацьмела золата найлепшае« у »Бацькаўшчыне« (Нр. 196-197, 1954). Аўтар працаваў над такімі кніжкамі, зь якіх толькі невялікія часткі друкаваліся ў розных эміграцыйных часапісах або газэтах: »Антыбальшавіцкія паўстаньні й партызанцкае змаганьне на Беларусі«; »Не чарнілам а крывёю«; хрэстаматыя: »Рэлігія ў творчасьці беларускіх пісьменьнікаў«.[24]) Якая шкода, што гэта хрэстаматыя не ўбачыла Божага сьвету ў друку! Бо хто-ж мог быць больш кампэтэнтным ад Юркі Віцьбіча, каб апрацаваць такую хрэстаматыю.

Спадчына Віцьбіча знаходзіцца сяньня рассеяная ў розных эміграцыйных часапісах і газэтах і важным было-б для нашай ня толькі літаратуры, але культуры вогуле сабраць яе і выдаць асобнымі кніжкамі. Бяз сумніву яна на гэта заслугоўвае.

Юрка Віцьбіч быў узвышанец і аб »Узвышшы« паўсталым 26 траўня 1926 г., а зьліквідаваным у 1931 ён ніколі не забываў-

---

21) Алесь Салавей, Ліст у рэдакцыю з дня 25.I.1947, Шыпшына, Нр. 4, с. 41.

22) Копія ліста ў Архіве ББ імя Ф. Скарыны ў Лёндане.

23) А. Багровіч, Адыйшоў майстра мастацкага нарысу. Беларус, люты 1975, Нр. 214.

24) У »Шыпшыне«, 1946, Нр. 3, с. 45, маем гэткую зацемку: »Пісьменьнік Юрка Віцьбіч працуе над цыклем апавяданьняў: »Не чарнілам, а крывёю«. Адначасна складае хрэстаматыю: »Рэлігія ў творчасьці беларускіх пісьменьнікаў«.

згуртаваньня была вынесеная пастанова яго сяброў: »Узвышша«, 1931, Нр. 11-12, с. 178-180.

ся.[25]) У 20-я ўгодкі утварэньня »Узвышша« ён пісаў у »Шыпшыне«: »Вакол літаратурнага згуртаваньня »Узвышша« ядналася усё самае патрыятычнае і таленавітае, што мела тады беларуская літаратура. Пад уплыў »Узвышша« адразу трапіў шэраг пісьменьнікаў з іншых тагачасных літаратурных згуртаваньняў. »Узвышша« пераступіла ўсходнія і заходнія межы краіны . . . узвышэнцы закладалі падмурак тэй вялікай нацыянальнай літаратуры, якую паводле іхніх »тэзісаў«, павінны пабачыць вякі і народы«.[26])

Варта і нам прыпомніць тыя тэзісы. »Магчымасьць утварэньня узвышша беларускай мастацкай літаратуры мысьліцца цераз:

а) культуру беларускае мовы,

б) жыцьцёвую сымболіку мастацкага твору,

в) яго концэнтрацыйную вобразнасьць,

г) дынамічнасьць композыцыі,

д) беларускую жанровасьць,

е) адзінства творча-мастацкай ідэі,

ж) рознастайнасьць формальных рэальнасьцяй і

з) аквітызм, як тую імклівасьць, якою прасякаецца мастацкі твор у сваім адэале . . .«[27]

Юрка Віцьбіч узвышанец, пасьля шыпшынавец (ідэёвай розьніцы у гэтых сымбалічных назовах мы ня бачым) увайшоў у беларускую агульна-нацыянальную літаратуру сваей уласнай тэматыкай, са сваім арыгінальным стылям. Крыніцамі яго творчасьці была тысячагадовая гісторыя Беларусі, яе легенды, фальклёр і звычаі. Ён знаў Беларусь у часе (гісторыя) і ў прасторы (археалёгія, этнографія, географія). Ён быў глыбока рэлігійным і таму цікавілі яго сьвятыні, жыцьці сьвятых, іконы, царкоўная архітэктура.

З пад яго пяра вышлі аповесьці, мастацкія нарысы, эсэі, фэльетоны, палемічныя артыкулы. Кожны яго нарыс апіраўся як на цьвёрдую базу на гісторыяй устаноўлены факт, або ім самым сьцьверджаны. Характэрным для яго кароткія творы з доўгім назовам. Нярэдка яны ёсьць сатырай, прыкладам »Трубадур віцебскіх падпольных пацукоў«, »Пра шылы тамтэйшае нэндзы«, »Ці толькі абаранкі патрэбныя беларусам?«. Часам называў аўтар свае творы пранікліва-сэнтымэнтальным сказам: »Ня змоўклі Віцебскія арганы«, »Яны прасілі лусту хлеба« і інш. Але ёсьць і вельмі падбадзёрвуючыя: »Урачыста панясём цымбалы многозвонныя, »Вышэй галаву Дубавец«, »Усіх не расстраляеце«. Дзеля сваей моцы гэты тытулы твораў запамятваюцца лёгка і на доўга. У беларускай літаратуры Віцьбіч займае першае і выдатнае месца, калі йдзе гутарка пра мастацкі нарыс. Зусім слушна Багровіч назваў яго майстрам мастацкага нарысу.[28])

Іншым жанрам у творах Віцьбіча зьяўляюцца эссэі. Усе хто дагэтуль пісалі аб ягонай творчасьці прайшлі паўз іх і не заўважылі. Эсэям звыкла называюць кароткі літаратурны твор у прозе, у якім выяўляюцца глыбейшыя веды і пагляды аўтара на нейкі прадмет ці асобу. Ў эсэі неканечна мае быць апісана поўнасьцю выбраная тэма, але аўтар у штосьці павінен углыбіцца і дайсьці да самай суці. Такі жанр літаратурнай творчасьці запачаткаваў француз Мішэль дэ Монтэнь у XVI ст. Ягоныя эссэі былі ў канцы таго самага стагодзьдзя перакладзеныя на ангельскую мову. У XIX ст. пісалі эссэі Чарль Лямб, Вашынгтон Ірвінг і іншыя. У наша стагодзьдзе былі ведамымі са сваіх эссэяў Чэстэртон, Бэльлёк, Мігуель дэ Унамуно.

Што Віцьбіч сьведама працаваў у жанры эссэяў сьведчыць той пратэст, які ён зрабіў, калі »Конадні«[29]) адзін з яго абразкоў назвалі нарысам. Пры той-жа нагодзе ён сам назваў некалькі сваіх эссэяў: »Завулка Янкі Купалы«, »Каб я каршуном радзіўся«, »І гарыць вачыма карымі горкі прыпамін«, »Ходзіць па нашай краіне Рагнеда«.[30])

Апрача эссэяў знаходзім у творах Віцьбіча *абразкі,* пыкладам »Мы дойдзем«,[31]) якія культывываў Бядуля; а таксама *лірычную імпрэсію,* якую ён сам называе »Так станецца«,[32]) а да якой таксама трэба ўлічыць цудоўна прыгожы твор »У той самы час«.[33])

Віцьбіч дасканала валодаў расейскай мовай і ў гэтай мове пакінуў больш 200 твораў

[25]) Аб »самаліквідацыі« літаратурна-мастацкага згуртаваньня была вынесена пастанова яго сяброў: »Узвышша«, 1931, Нр. 11-12, с. 178-180.

[26]) Шыпшына, 1946, Нр. 2, с. 1.

[27]) Узвышша, Менск, 1927, Нр. 1, стр. 169-170.

[28]) А. Багровіч, Адыйшоў майстра мастацкага нарысу. Беларус, люты 1975, Нр. 214.

[29]) Ню Ёрк, 1954, Нр. 1, с. 18.

[30]) Ліст у рэдакцыю з дня 15.VIII.1954. Бацькаўшчына, 29 жніўня 1954, Нр. 32-33 (214-215), с. 2.

[31]) Беларус, 1969, Нр. 151, с. 3.

[32]) Конадні, 1954, Нр. 1, с. 18. Гл.: Бацькаўшчына, 1954, Нр. 32-33 (214-215).

[33]) Бацькаўшчына, 25 траўня 1953, Нр. 12-13 (143-144).

Працяг на с. 25.

THE HEAVENLY FIRE

A STUDY OF THE ORIGINS OF THE BYELORUSSIAN NEW TESTAMENT AND PSALMS (1931)

"In the White Russian people a fire is burning, which can become very perilous; let us put out a hellish fire by means of the heavenly fire of Our Lord Jesus. Let us give the White Russian people the New Testament with Psalms in the White Russian language!".

Pastor S. Loppe (1927)

Five years ago, on the 14th August 1970, at Leominster in Herefordshire, there died a retired officer of the British and Foreign Bible Society, Wilfrid James Wiseman. For eleven years he had served as the Society's Secretary for North Eastern Europe first in Riga, then in Helsinki and for twenty-one years as Secretary for Russia. Thanks to the solicitude of his widow, his carefully preserved archives were deposited quite recently in the Society's library in London. It is from these documents, and from the Society's other records kept at their headquarters that the material for the present study has been drawn.[1])

Born in 1891, Wiseman was brought up in Wales, and had as a child acquired a knowledge of and a liking for the Welsh language.[2]) It is safe to assume that this knowledge predisposed him somewhat in favour of minority languages, and indeed he appears to have devoted his life to them.



Wilfrid James Wiseman (1891-1970)

When in 1925 he was appointed to the Secretaryship for North-Eastern Europe and Russia, he inherited from his predecessor Walter Davidson a daunting task. The area was relatively little known, and with independence from Russia, the demand for Bibles in a variety of Baltic, Ugro-Finnish and Slavonic dialects was brisk. It was his duty to make the Scriptures available to these people, and to deal also with a flood of enquiries, sometimes bizarre, ranging from the possibility of supplying a Russian Bible in Braille to a blind reader in Moscow, to a request from an enlightened Ukrainian Canadian who has "seen visions and dreamed dreams — sheaves of corn falling from the sky which made him fall to the earth, to print the details of these visions in every language and send to all the nations of the earth."[3])

During his tenure of office he was called upon to investigate the need for a Bible in what, in the West, appeared to be a somewhat shadowy language — Byelorussian or "White Russian",[4]) and having done this, to cope with the complex, not to say delicate problems relating to translation and publication.

There was indeed a desperate need for spiritual literature, and in particular for a

1) The author is indebted to Mrs Wiseman for a number of personal reminiscences concerning her late husbands work in Riga and Helsinki, to the British and Foreign Bible Society for their kind assistance and permission to examine their Archives.

2) W. Wiseman, Autobiographical note, Ms., Bibl. BFBS.

3) W/R 10 February 1927. For the purposes of this study the following abbreviations have been adopted: R — Revd. John Holland Ritson, General Secretary of the BFBS; K — Revd. Robert Kilgour, Editorial Superintendant BFBS; H — Arthur Haig, Secretary for the Central European Agency BFBS; W — Wilfrid Wiseman, Secretary for the North-East European agency; D — Davidson, Secretary for the North-East European agency until 1924; L — Anton Luckievič; DM — Pastor Lukaš Dziekuć-Malej. Correspondence passing between these persons is indicated by the abbreviation of the names of the writer, and of the addressee, followed by the date.

4) The expression *White Russia* has now generally given place to the less confusing term *Byelorussia*. In the present study, where the original English text refers to *White Russia* or *White Russian* the term has been retained; elsewhere the expression *Byelorussia* or *Byelorussian* is used.

Bible in the vernacular, the more so since at least two and a half centuries had elapsed since any Biblical texts had been printed in Byelorussian. Of course, versions of Biblical books in Church Slavonic and Middle Byelorussian had circulated in manuscript since the 15th century, and the texts published by Francis Skaryna (1517-1519 and 1525),[5]) Vasil Tiapinski (1570-1580)[6] and those of the *Učytelnaja Evanhelija* (1616),[7] had achieved great popularity in their day. But the decline of the Byelorussian language under Polish and Russian domination, and the destruction or loss of many of the older editions, had left the Byelorussian people at the beginning of the 20th century with virtually no Scriptural texts in their own language.

And yet, as Wiseman observed after a visit to Vilna: "The White Russians were one of the first nations to have the Scriptures printed in their own language. This was in 1517, eight years before the first published edition in English. Who could tell what White Russian might have been today, had not the persecution and oppression of the Jesuits in the 16th century, succeeded by subsequent oppressions, brought the people into the very low state in which they find themselves today. The proportion of illiteracy is very high, and exact figures are not obtainable. Their forefathers had the Bible four hundred years ago, and only two copies of that remain. With the prohibition and destruction of the Book there came an extinction of light and hope".[8])

The familiar and facile tilt at the Jesuits was a little unfair; both Catholic and Orthodox ecclesiastics had, as has been mentioned, been involved in the publication of parts of the Gospels and Psalms into Middle Byelorussian, and there is persuasive evidence that Skaryna himself, to whose work Wiseman refers, professed the Catholic faith.[9] Nor were the Protestants, apart from Tiapinski, much concerned with publications in the vernacular, Biblical or otherwise. It is now know that the first steps in recent times to promote the use of Byelorussian in the Church and in religious publications were taken by Catholic hierarchs, such as Bishop Albin Symon (1841-1918), Archbishop Edvard Ropp (1851-1939) and Bishop Ściapan Daniševič (1836-1913).[10] Indeed this latter prelate gave his *imprimatur* to an interesting little translation, published in St. Petersburg in 1914, of Fr. I. Shusters abbreviated *biblia pauperum* entitled *Karotkaja Historyja świataja,* which was reprinted a second time in Vilna in 1917.[11]) Again after the first World War, a Catholic priest from Dziedzinka, Fr Idelfons Bobič (1890-1943) published in 1922 a Byelorussian version of the Lessons and Gospels appointed to be read during Mass on Sundays and feastdays.

The collapse of the Russian Empire in 1917, and the emergence of a number of independent successor states on the former Western territories of the Tsars — Poland, Latvia, Lithuania and Estonia — opened the gates of these lands to a growing number of Protestant missionaries from Germany, England and the United States. They came, earnestly intent on evangelising what the Lutheran pastor of Vilna, S. Loppe, described as "the poor, blinded White Russian people [who] are in erroneous ways".[12]) Ignorance there was aplenty in Byelorussia, and this went hand in hand with a sense of social injustice and national frustration. Neighbouring peoples were enjoying the fruits of land reform and national independence, whereas political expediency and the Treaty of Riga (1921) had deprived the people of Western Byelorussia of their aspirations to self-government, and their leaders felt they had been cheated. Moreover, the feeling was abroad that no sympathy could be expected for the Byelorussian language from the established religions. "There is, wrote one Byelorussian teacher from Latvia, no hope that in the near future the Byelorussians will succeed in undertaking the publication of the Bible by their own means, for the Byelorussian Orthodox and Catholic clergy, in their mutual struggle for the dominating influence upon the Byelorussians, are accustomed to look for assistance to the neighbouring peoples, the Orthodox to the Russians, the Catholics to the Poles; as to their nationality, the greatest part of the clergy is not even Byelorussian, and the Byelorussian clergy is not yet sufficiently provided with means to undertake such a large publication".[13])

---

5) See P. V. Vladimirov, *Doktor Francisk Skoryna,* StPbg. 1888.

6) See M. Dovnar-Zapolski, 'V. Tiapinski', *Kievskaja Starina,* Kiev, 1889, No. I; M. Harecki, Historyja Biełaruskaje Literatury, Vilna 1924, pp. 25-27.

7) See Harecki, op cit., pp. 53-54.

8) W/R 24 October 1928. John Ritson (1868-1953) was General Secretary to the Society from 1899-1931.

9) A. Nadson, 'Skaryna's Prayer Book', *Journal of Byelorussian Studies (JBS),* II, 4, London, 1972, pp. 346-347.

10) Č. Sipovič, 'The language problem in the Catholic Church in Byelorussia from 1832 to the First World War' *JBS,* III, 1, London, 1973, pp. 3-40.

11) The date is that given in *Lietapis Biełaruskaha druku,* č. II. Mensk 1929 p. 30. However the *approbatur* is dated in St. Petersburg, 24 January 1907.

12) S. Loppe, Memorandum 15 October 1928.

13) Jezavitaŭ/W., 27 March 1926. The letter was written on behalf of the Administration of the Society of White Ruthenian Teachers in Latvia. Krasnievič was also a signatory.

Another more immediate and perilous threat to the spiritual welfare of the Byelorussian peasantry was accurately pin-pointed by Emil Süsemihl: "The fifteen million Byelorussians unfortunately possess to date no Christian books in their language. Without Christian literature, they are in danger of becoming victims to the anti-church, atheistic propaganda of the bolsheviks. The bolshevicising of the Byelorussians makes daily progress, especially among the young".[14])

Abandoned and frustrated, it is hardly surprising to learn of the growing success of the foreign evangelical missions among the Byelorussian population. As one correspondant in the London *Times* observed, after a visit to Western Byelorussia in 1926,: "Thousands of peasants are turning from the customary services of the Russian Orthodox Church, and are holding meetings of an evangelistic kind familiar in Great Britain and America during the last half century. Revival hymns are great favourites, and at a touch of the tuning fork, a congregation would burst forth into harmonious song. These services among the 'believers',



Pastor Łukaš Dziekuć-Malej (1888-1955)

the designation by which these groups are known, are so popular that in one village where I addressed a large gathering, the parish church is almost deserted".[15])

A Methodist missionary writing from Vilna two years later, bears witness to the proliferation of protestant missions there: "The Lutherans are here too, and the Evangelical Reformed or Calvinists, the Methodists, the Baptists and some Holiness sects, including the pre-milinarianists."[16]) The Baptists had, of course, been active in the Russian Empire well before the Revolution, and had established the headquarters of their Polish mission in Łodz under a Mr Gregory. One of their most valuable helpers among the Byelorussians was destined to play a leading role in the promotion and translation of the Byelorussian New Testament.

Lukaš Dziekuć-Malej (1888-1955)[17] was a native of the Slonim region, who became a Baptist in 1910. Having received a sound training as a teacher and attended Bible course in St. Petersburg for two years, he was well equipped to assist his foreign co-religionaries in their missionary work. Already in 1920 he was collaborating with Gregory, setting his pen to the service of the Baptist church, and, as he wrote: "I translated some pamphlets published by the *Kompas* publishing house in Lodz. From 1920 to 1924 I . . . also translated alone 17 booklets from the Polish and Russian to the White Russian language".[18]) He had set himself the ideal of "striving for a full Bible in White Russian that could be offered at low price to the poor White Russian people ruined by the War".[19]) A well-known Byelorussian patriot, he settled down in Brest-Litovsk and in due course became a Baptist minister.

The American Methodists, whose Polish mission was centred in Warsaw, were also increasingly active among the Byelorussian population, and were to play a significant part in the publication of the Byelorussian New Testament. One of their pioneer ministers was

14) E. Süsemihl/BFBS, 15 December 1925.

15) J. Hay Colligan, 'White Russia — A visitor's impressions', *The Times,* 7 September 1926. The author of this letter was the President of the Presbyterian Historical Society of England.

16) E. Case, 'Miss Case visits Poland', *Missionary Voice,* Vol. 18, No. 11, p. 26 (426).

17) For a brief Biography see A. Š. (Anton Šukialojć), 'Lukaš Dziekuć-Malej', *Biełarus,* 20 September 1955, No. 3 (53), New York, p. 4.

18) Luka Nikolayevich Dziekuć Malej, Information regarding the persons to whom the British and Foreign Bible Society entrusts Biblical translation work. 1929. (Ms).

19) Ibid.

83) He was consciencious to the point of revising and repolishing his *Kompas* Press translations which had already been printed previously inserting accents which had been omitted, and making corrections (see *St. Mark*, Ch. 1, v. 3. *Kompas* "rabecie": BFBS "rabicie", etc.).

84) On the life and work of this eminent writer and politician see A. Lis, *Branislaŭ Taraškievič*, Minsk, 1966.

85) For biographical details see V. Kalush, *In the service of the people for a Free Byelorussia*, London, 1964.

86) L. Horoška, 'Ajciec Adam Stankievič', *Božym Šlacham*, No. 68-69, Paris, 1955, pp. 16-20; also *Ks. Adam Stankievič*, Vilna, 1940.

87) A former member of the Byelorussian National Rada, Rak-Michailoŭski was elected a Byelorussian deputy to the Polish *Sejm* and played a significant role in the Socialist *Hramada*. On his release from prison after the notorious *Hramada* trials, he fled to Minsk, only to be arrested and executed shortly afterwards as a "Polish spy". On the *Hramada* generally, and Rak-Michailoŭski, see A. Bergman, 'Hramada praz 50 hod', *Biełaruski Kaliandar 1975*, Biełastok, pp. 142-159.

88) See Letter R. Astroŭski/V. Astroŭski, 9 November 1974. A copy of the relevant passage is in the Francis Skaryna Byelorussian Library, London.

89) Information given by V. Astroŭski and K. Hlinski.

90) Cf. note 105) below.

91) W/K, 11 June 1929.

92) See *Procès 490 de la Ghromade Biélorusse à Vilna*, Prague, 1928; cf. also note 83 above.

93) W/K, 25 March 1929.

94) W/K, 16 April 1929.

95) W/K, 25 March 1929.

96) L/W, June 1929.

It was not until 14th July 1930 that Pastor Witt, who seems to have taken over the administrative work of the venture in Vilna, handed over the Manuscripts to the Bible Society's secretary for Central Europe A. L. Haig in Berlin.[97]) The printing work had already started on the Gospel of St. Mark, on the initiative of Mr. Kingston, through the *Kompas* Printing house in Lódz. Having obtained an improved set of type from London, the *Kompas* Press had produced in 1929-30 a version of this Gospel virtually identical to the Society's, and which may have been in the nature of a "pilot", as well as a completion of the series of four Gospels produced by the Baptists.[98]) By January 1931 the proofs of the New Testament had been corrected, and the completed work appeared later in the year. The title page gave the place of publication as Helsinki, although the work was actually printed in Lodz, Poland, since Helsinki was the headquarters of the North East European Region of the Society, dealing with the Byelorussian New Testament.[99]) Since the majority of the Byelorussian population lived in what was then Eastern Poland, and all the translation work on the Testament had been done in Vilna or Brest, it would have been natural for the Central European Secretariate of the Bible Society, responsible for Germany, Hungary, Czecho-slovakia and Poland, to have seen the work published from Warsaw or Berlin. It was no doubt considered as a minor diplomatic success by Luckievič and his friends, that at least for the Society's purposes, Byelorussia was included in the separate North Eastern Region, along with the Baltic States and Finland.

Once printed, the New Testament appears to have sold like hot cakes, and achieved rapid popularity. One copy, autographed by Anton Luckievič himself, is to be found on the shelves of the Francis Skaryna Library in London. Its black cover, similar to that of the full 25.000 copies making up the first edition, bears the three-barred cross, the lowest bar inclined, commonly used by the Orthodox Church among the Eastern Slavs, — and thereby hangs a story.

During his visit to Vilna in the summer of 1928, Wiseman, mindful of the Society's policy of seeking the support of the local Churches in its work, made overtures to the Synod of the Orthodox Church in Poland. "I also consulted with the representative of the Orthodox Church, which is separate from that in Russia. Most White Russians belong to the Orthodox Church. By their laws, the Synod is unable to give its blessing or approval to any book not issued under their authority, and they have power to prohibit the use of any book issued without their *imprimatur*. Once they have placed their seal upon a book, that can be used in all subsequent editions. This is the same as with the Holy Synod in Russia.

"At first the good man seemed to seize upon the idea of the issue of a Testament in White Russian as a means for helping the Synod in its financial difficulties. He requested that the whole work should be prepared entirely at the Bible Society's expense and completed according to the Synod's directions, and corrections, and that an edition of 10.000 copies should be handed over unconditionally to them in the first instance with their name alone, and the name of the British and Foreign Bible Society must not appear anywhere in the Book. I thanked him most cordially for his offer, but expressed the fear that by the regulations of the B.F.B.S. this might not be entirely possible. On the other hand, would it be possible for the Synod, if the Book fully meets with their approval, and for the privilege of having their name on the title page, to pay actual cost plus 5% charges on the first edition of 10.000. The realisation of the cost of production and that books printed must be immediately paid for (in hard cash generally) rather seemed to take away his breath and he replied that the Synod had no money.

"In this case I said it should surely be possible to come to an amicable arrangement and possibly our committee might produce for them much below cost say 500 copies at one zloty (5d.) each as a first impression with their name in it so as to meet the requirements of their canonical law and so obtain their *imprimatur* for further editions. He was afraid that the Synod had not the 500 zloty (£11) for the purpose, and suggested that they should receive at least 1000 copies gratis. I said I was unable to promise but would put forward the suggestion. He thought it very probable that

97) W/K, 14 July 1930. Arthur Haig (1892-1965) was the BFBS agent for Central Europe from 1923-1939.

98) The type faces used in the Gospel of *St Mark* differ from those of the other three Gospels, and are identical to, though smaller than those used in the BFBS version.

99) It is also possible that the BFBS, mindful of McCallum Scott's advice, concerning the political advisability of publishing works in Poland or Lithuania, decided to select Helsinki as being a less controversial centre.

the Synod would give its authority if we would do this and I assured him we would do all we reasonably could to meet their wishes, and he seemed very pleased. It was understood that these 1.000 copies would be sent to the priests of the churches within the area of the Synod's control, which number nearly a thousand. At the same time the Synod would affirm that their authority had been given to the Book and this would prevent prohibitions or misunderstandings locally".[100])

It was subsequently agreed between the Society and the Synod that a Revision committee should be set up by the Orthodox to examine, and if possible approve, the Society's version of the *New Testament*. However, one year later, in July 1929, Luckievič, who was involved in the discussions with the Synod, wrote that "the question is as to how soon the Metropolitan will officially confirm the list of members of the committee that would confirm the translation".[101]) Another year passed, but in April 1930 little progress seems to have been made. A despairing Haig, writing from Berlin reported: "The translation of the *New Testament* has been finished for many months, but we have not yet received it, as it was handed over to the Orthodox Church for examination. Owing to difficulties in their Church, the examination has not yet been completed, but I am asking Pastor Witt to do all he can to push them on".[102])

In one of the committee rooms of the General Council of the Bar in London there hangs a small framed notice with the following words: "A committee is a dark passage-way down which good ideas are lured, and then quietly strangled". Mindful, perhaps, of this precept, the good Pastor Witt, after many months, thought it advisable to extract the Society's manuscript from the corridors of the Synod, and hand it over to Haig for the printers. So it was that the Byelorussian *New Testament* appeared with a cover already embossed with the Orthodox cross, but no synodal *imprimatur*.

The attitude of the Roman Catholic clergy towards the Society's initiative was equivocal. Whilst suspicious of its potential use as an instrument of "sectarian" propaganda, it provided the more nationally-conscious Catholic priests with a powerful argument against the Poles, and in favour of a wider use of the Byelorussian language in the churches. A memorandum was addressed to Pope Pius XI by a group of Catholic notables complaining that if no provision was made for the use of the vernacular by the clergy in Byelorussia, the people would fall victims to "sectarian" influences.[103])

But at least the appearance of the Byelorussian *New Testament* in 1931 prompted both the major Churches to publish some biblical texts in the vernacular, for in 1936 the Synodal Press of the Orthodox Church in Warsaw produced its own *biblia pauperum* in the Byelorussian language under the title *Śviaščennaja historyja Novaha Zavietu*, compiled by Siarhiej Paŭlovič, a candidate in Theology. Similarly the Byelorussian Catholic clergy, after some initial difficulties with the Polish hierarchy, were able to produce in 1938 a further collection of Gospels and Epistles for the Mass entitled *Božaje Słova*, compiled by Fr. Adam Stankievič, as well as a version of the *Four Gospels and Acts*, translated and published in 1939 by Fr Vincent Hadleŭski (1888-1942), bearing the *approbatur* of the Catholic Archbishop of Vilna, Romuałd Jałbrzykowski. This latter work had been in preparation since 1933, to counteract the success of the "recently published translation of this book [i.e. *The New Testament* — G. P.] by the Methodists, which contains dogmatic errors, many inaccuracies, and also numerous imperfections as regards the Byelorussian language".[104]) In fact Hadleŭski's translation, though arguably more precise, falls short of the high literary standard of the Luckievič version; it is however, unquestionably superior to the later New Testaments of Mgr Piotr Tatarynovič (1954, 1974) and Dr

100) W/K, 24 October 1928.

101) L/W, June 1929.

102) H/K, 28 April 1930.

103) J. Piatroŭski, 'Uspaminy', *Śvietač Chystovaje Navuki*. 1 (49) N.Y. 1961 p. 3. The well-known Byelorussian prelate Andrej Cikota, in a memorandum addressed to the Congress of Archbishops and Bishops in Vilna, dated 10 November 1926, pursued a similar line of argument. "In these conditions, instead of the leaven of Christ, there is a ferment of Methodists and Communists, who put our indifference to the service of their cause. Methodist propaganda reaches the Byelorussian through Byelorussian Gospels, Byelorussian hymns, Byelorussian sermons, Byelorussian catechisms and so on, and not only amongst the Orthodox, but also many Catholics who live closely to them, and who produce their works in latin characters. The Byelorussian intelligentsia is turning *en masse* towards Methodism or atheism" (p. 2). A certified copy of this Memorandum is to be found in the archives of the Francis Skaryna Byelorussian Library in London.

104) *Chryscianskaja Dumka*, No. 2 (83), Vilna, 1933, p. 8 (facing).

Janka Stankievič (1970). None has surpassed the Luckievič version in popular appeal.

When, in the aftermath of the Second World War, several thousand Byelorussian refugees found themselves dispersed throughout Western Europe, there was a substantial demand for the Bible Society's *New Testament,* though the first edition had for some time been unobtainable. In 1946 Dr Vitaŭt Tumaš, well-known for his work in the field of *Skaryniana,* approached the Society with a request to publish the whole Bible, or at least to produce a second edition of the *New Testament and Psalms* in Byelorussian. In this he had the support of a number of Byelorussian Protestant ministers, as well as several Catholic and Orthodox priests. A new edition was duly published in 1948, and is still widely used.[105])

[105]) D. Jaśko, 'Novy Zapaviet u biełaruskaj movie', *Backaŭščyna,* 4 (48) Munich 1949, p. 3.

The principal actors of this not undramatic episode in the ecclesiastical history of Byelorussia have almost all passed away. Anton Łuckievič perished in a Soviet concentration camp in 1946. Pastor Dziekuć-Malej died in America in 1955, a widely-respected and saintly man. Wilfrid Wiseman, who toiled so devotedly in the Lord's vineyard, departed this life in 1970. Leŭčyk, Ŭłasaŭ, Rak-Michailoŭski, Jezavitaŭ, Taraškievič, have entered into the history of their nation. Their endeavour, their work remains, a monument to the faith of some, the patriotic dedication of others, and a light to the enlightenment of the Byelorussian people.

Guy Picarda



на розныя тэмы і розных жанраў. Яны друкаваліся ў »Новым Русскім Слове«. Там ён інтэлігентна, мужна і па мастацку абараняў усё наша беларускае вялікае і нам дарагое.

*

Калі мы ўжо ўспаміналі аб шматлікіх дататніх якасьцях і аб розных жанрах пісьменьніка Віцьбіча, дык варта было-б сказаць хоць пару слоў аб некаторых ад'емных рысах. На нашу думку стыль яго занадта грузны, сказы выпрацаваныя аж да штучнасьці. Віцьбіч — гэта слонь у цырку або молат у кузьні, першы цікавы, але трэба ўважаць, каб не наступіў на ногу, — а другі моцны, але абодвы цяжкія. Таксама ня ўсе ягоныя нарысы беззакідна абгрунтаваныя з гледзішча гістарычнай навукі. Часам цяжка разабрацца, дзе ў яго легенда, а дзе запраўдны факт. Мова яго багатая, сакавітая, але адчуваецца, што яна не зь беларускай гушчы, а зь нейкай акадэмічнай працоўні. Некаторыя словы ён вельміж часта паўтарае, прыкладам »прачулы«, »прыгадаць«, »дарэчы«. Ён ужывае »трэйці« замест агульна прынятага »трэці«.

*

Цяпер астаецца нам глянуць на Віцьбіча як на чалавека, якога мы пазнаём праз прызму яго літаратурнай спадчыны. Каб тут дайсьці да праўды, трэба было-б узяць пад увагу ўсю ягоную творчасьць ўлучна з той, што яшче знаходзіцца ў сховішчах. Гэта тымчасам немагчыма таму карыстайма з таго, што ўжо іх самім за жыцьця было апублікавана, дый тут мы мусімо абмежыцца толькі да некалькі пытаньняў.

У 1953 г. у мюнхэнскай »Бацькаўшчыне« Нр. 28 (159) быў надрукаваны артыкул: »Што нам патрэбна«, у якім Віцьбіч парушыў шмат розных вельмі важных для беларускай эміграцыі праблемаў. Быў гэта дадзены адказ Вярбе на яго артыкул у той самай газэце: »Ці можам быць незадаволеныя?«,[34]) але той адказ не страціў вартасьці для ўсіх нас да сяньня.

У галіне палітычнай здарыўся нязвычайны выпадак у гісторыі Беларусі: прызнаньне Беларусі ў форме БССР як роўнага сябру Задзіночаных Нацыяў. Віцьбіч прызнае часткова рацыю М. Вярбе, што Беларусь »набрала міжнароднай вагі«, аднак сьцьвярджае, што гэта сталася 35 год таму назад (ён пісаў у 1953 г.), калі яе рэпрэзэнтавалі нашыя дзяржаўныя мужы, упоўнаважаныя на гэта Першым Усёбеларускім Кангрэсам, а не расейскі бальшавік разанскага паходжаньня Кузьма Кісялёў, які рэпрэзэнтуе цяпер БССР і прызначаны заняць месца ў палацы Аб'еднаных Нацыяў Масквой.

У галіне навукі было пастаўленае пытаньне: пакольні нам трэба лічыцца з вучонымі Захаду? Віцьбіч адказвае: ці мы падабаемся замежным вучоным ці не — гэта ўсё другараднае. »Галоўнае, істотнае — спалучыўшы ўсе свае высілкі разам, стацца годнымі ў галіне навукі й мастацтва найлепшых традыцыяў свайого народу і Бацькаўшчыны, а значыцца і належным чынам рэпрэзэнтаваць іх на чужыне ў вачох усяго культурнага чалавецтва«.

Аб падручніку др. Янкі Станкевіча ён высказаўся гэтымі словы: » . . . не зьяўляючыся асаблівым сымпатыкам гэтага падручніка, я ўсё-ж мушу сьцьвердзіць, што дагэтуляшняя крытыка яго выходзіла пераважна зь не навуковых крыніцаў, а з палітыканскадылетанскіх«.

З мэтадамі др. Я. Станкевіча Віцьбіч не згаджаецца. Ён кажа: »нашая літаратурная мова ні ў якім разе ня спыніла свой пераможны рух наперад, але ейнае ўзбагачэньне зусім не павінна ісьці па лініі фабрыкацыі ва ўласнай мовазнаўчай лябараторыі новатвораў, або па лініі засьмечваньня яе слоўнікам пэўнага самотнага засьценку, што знаходзіцца на нашых этнаграфічных паўзьмежжах . . .«

Хаця Віцьбіч сам стварыў арганізацыю пісьменьнікаў, аднак ён ня лічыць патрэбным мець толькі адну-адзіную арганізацыю, як гэта сталася ў Савецкім Саюзе, а што ён называе літаратурным калгасам. Многасьць розных арганізацыяў спрыяе розным кірункам і пісьменьнік можа выбраць для сябе такую, якую сам сабе спадабае.

Віцьбіч не чураўся назову »Крывіч« і ужываў яго ў аднясеньню да старадаўняй беларускай гісторыі,[35]) але ён быў наважа-

[34]) Бацькаўшчына, 19 красавіка 1953, Нр. 16 (147), с. 4.

[35]) Прыкладам яго нарыс: »Мы былі і будзем крывічамі«, Беларус, 1972, Нр. 186, с. 3-4.

ным праціўнікам уводзіць сяньня назоў »Крывіч«, »Крывія«. Аб гэтым ён высказаўся: »Сёньня прапаганда тэрміну »Крывіч« носіць ужо не акадэмічны характар, як у часы аднаго са славутых беларускіх дзеячоў Вацлава Ластоўскага, а выключна палітычны«.[36]) Між іншым Віцьбіч вельмі цаніў Власта (Ластоўскага) і называў яго адным з найцікавейшых нашых пісьменьнікаў.[37])

Віцьбіч быў рашучым ворагам камунізму і знаў усе яго нялюдзкія злочыны і біў па іх з плеча. За гэта ён атрымоўваў найбольш з усіх беларускіх пісьменьнікаў і журналістаў нападак і мянюшак з савецкага боку. Значыць пападаў метка.

Быўбы наш гэты нарыс незакончаным і крыўдным для с. п. Юркі Стукаліча-Віцьбіча, каб мы ня ўспомнілі аб яго асаблівай рэлігійнасьці. Годзе перегарнуць бачынкі часапісаў з артыкуламі Віцьбіча, асабліва рэлігійных часапісаў, каб праканацца, што наш пісьменьнік нятолькі верыў у Бога, але ён быў у рэлігійных справах адукаваны на роўні сьвятара. Ён бараніў рэлігіі, сьвятыняў. Ён зьяўляецца найлепшым сьветкай паганьбаваных збураных на Беларусі цэркваў, касьцёлаў і сынагогаў. Віцьбіч — гэта вялікі паклоньнік Найсьвятой Божай Маці, ён нятолькі моліцца да яе у традыцыйнай старaславянскай мове, але ён сам творыць новыя беларускія малітвы. Ён моцна праваслаўны і выкідвае Кавалю, што ў сваім даведніку ня ўспомніў аб сьв. Апанасу Берасьцейскім, але ён таксама піша прыгожы нарыс аб вуніяцкім Мітрапаліце Булгаку і аб каталіцкім сьвятым Антонім Падуанскім і то так, як гэта могбы напісаць толькі добры каталік і добры пісьменьнік.[38])

Юрка Віцьбіч быў хрысьціянін. Ён знайшоў у сваей душы даволі адвагі і сілы, каб абараніць чорных, якія куды раней чым ён сам і чымся ўсе беларусы эмігранты былі ганебна перавезеныя ў Амэрыку і праз доўгі час не маглі дабіцца людзкіх правоў і тут.

»Незалежна ад колеру скуры — ці белыя, ці чорныя, ці жоўтыя, ці чырвоныя — мы ўсе адзінага Бога дзеці. Адзін за адным народы Афрыкі ськідаюць зь сябе каляніяльныя ланцугі, становячыся дзяржаўнымі. Лепш пашукаем паміж імі сваіх сяброў, чым варожа да іх паставімся«, пісаў Віцьбіч ў адказ на закіды супроць чорных.[39])

Віцьбіч — гэта наш выдатны пісьменьнік, неабцяжаны ніякімі ўпярэджаньнямі да ўсяго таго, што Беларусь мела і мае добрага і вялікага, непрымірымы вораг камунізму і расейскага насільля. Гэта слаўны сын Веліжа, Віцебска . . . і ўсей Беларусі. Яшче няраз мы на чужыне будзем навяртаць да яго.

А. Дзе-ка

---

[36]) Зьвіняць Званы Сьвятой Софіі, травень 1943, Нр. 4, с. 31.

[37]) Глядзі артыкул Віцьбіча: »Власт — Вацлаў Ластоўскі«, Бацькаўшчына, 1 лістапада 1953, Нр. 43 (174), с. 3.

[38]) Гл.: »Кепска каля Віцебска, а ля Воршы 'шчэ горшы«. Бацькаўшчына, 25 лістапада 1956, Нр. 47-48 (329-330).

[39]) »У вабарону маіх суседзяў«. Бацькаўшчына, 25 сакавіка 1959, Нр. 11-12 (447-48), с. 7.
O1

а. Т. ПАДЗЯВА

ДОБРАЯ НАВІНА XIV-ая КАТЄХЄЗА

ГРЭХ АДАМА ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ЯГОНЫХ ПАТОМКАЎ

Сьвяты Павал піша ў лісьце да Рымлянаў: »Праз аднаго чалавека увайшоў у сьвет грэх і праз грэх — сьмерць перайшла на ўсіх людзей, бо ў іх *усе саграшылі* . . .« (Рым. 5, 12).

Кніга Быцьця расказвае аб выніках грэху першых людзей у жыцьці іхніх патомкаў. Патомкі Адама таксама грашылі. Як і Адам: яны часта бывалі непаслушнымі Богу. Калі старэйшы сын Адама, Каін, зьненавідзіў Абля, свайго малодшага брата, сам Бог перасьцерагаў яго, каб стараўся запанаваць над ненавісьцю, бо інакш яна запануе над ім і

давядзе яго да няшчасьця. Каін не паслухаў Бога і ненавісьць так засьляпіла яго, што забіў брата.

Калі людзі грашылі, яны, як Адам, адварочваліся ад Бога, а на месца Бога ставілі самых сябе. Кніга Быцьця ў апавяданьні аб патопе паказвае, да якіх згубных вынікаў даводзіць грэх.

Бог ратуе тых, што як Ной слухаюць Яго, ратуе ад катаклізмаў у прыродзе, а непаслушных пакідае без сваей помачы. Бог нікому не навязваецца проці ягонае волі, а толькі паказвае чалавеку, што ён за малы і за слабы, каб даць сабе раду бяз Бога. (Глядзі Кнігу Быцьця, разьдзелы 6-8).

Але і пасьля патопу грэх ня зьнікае ў жыцьці людзей. Патомкі Ноя грашылі таксама. Сьвятое Пісаньне апісвае асабліва грахі ізраільскага народу. Грахі іхнія былі падобныя да грэху першых людзей. Гэты народ ішоў за сваімі нахіламі насупраць таго, чаго вымагаў ад яго Бог.

Адам, як галава ўсяго чалавецтва, парваў з Богам лучнасьць і загубіў дар надпрыроднага жыцьця, які меў перадаць сваім патомкам. Бяз лучнасьці з Богам, бяз асьвячаючай ласкі чалавеку не хапае сілы, каб перамагчы зло. За вынятнам Хрыстовае Маці, усе людзі родзяцца без асьвячаючай ласкі — без дару надпрыроднага жыцьця, які па Божай волі павінны былі-б мець і таму гэты недахоп ласкі ў кажным чалавеку лічыцца грахом, хоць вінаваты за гэта толькі адзін Адам. Таму гэты грэх называецца *першародным.*

Ісус Хрыстос вярнуў нам лучнасьць з Богам, надпрыроднае жыцьцё дзяцей Божых. Хто праз хрост лучыцца з Хрыстом, атрымлівае ад Яго надпрыроднае жыцьцё і гэтак ужо не мае першароднага грэху, але стаўся сынам Божым. Але ў ахрышчаным чалавеку астаюцца яшчэ сьляды, якія існавалі ў прыродзе чалавека: гэта большая склоннасьць да грэху, чым да добрых учынкаў, цярпеньне дый сьмерць.

Наш адказ Богу: Як Божае дзіця я хачу кіравацца ў жыцьці розумам асьвечаным верай. З помачай Божай буду старацца апанаваць свае нахілы да зла.

Прыклад малітвы: О, Божа, не адкажы мне сваіх нябесных дараў. О, Божа, даруй мне тое, што саграшыў я думкай, словам або ўчынкам. Барані мяне ад маладушнасьці і закамянеласьці сэрца. Выбаў мяне ад усялякай граховай пакусы. О, Божа, асьвяці маё сэрца, загіджанае дрэнным пачуцьцём. О, Божа, я грэшны чалавек, а Ты Бог міласьцівы: Ты знаеш маю слабасьць — зжалься нада мною. О, Божа, пашлі мне на помач Тваю ласку — праслаўляці сьвятое Імя Тваё!

О, Хрысьце, Збаўца мой! Упішы мяне, свайго слугу, у кнігу жыцьця і дай мне шчасьлівую сьмерць, Божа мой, хоць дагэтуль не зрабіў я нічога добрага прад Табою. Успамажы мяне сваею ласкай зрабіці пачатак добрага. О, Божа, пакрапі маё сэрца расою ласкі Тваей. О, Валадару неба і зямлі, успомні мяне грэшнага слугу свайго ў валадарстве тваім!

О, Божа, прымі мяне раскаяннага. Не адступайся ад мяне. Не дай мне зваліцца ў продню зла. О, Божа, дай мне сьлёзы пакуты і памяць на сьмерць. Дай мне цноты пакоры, чыстаты, послуху. Дай мне цярплівасьць, вялікадушнасьць, лагоднасьць. О, Божа, заложы ўва мне фундамант добрага і страх прад Табою ў сэрцы маім. Няхай буду я здатным любіць Цябе з цэлага сэрца і чыніці заўсёды волю Тваю. Барані мяне ад сапсутых людзей, ад духаў нячыстых, ад злога пажаданьня. Божа мой, Ты ўсё робіш паводле Сваей волі прадвечнай, няхай-жа воля Твая споўніцца нада мною грэшным. О, будзь багаслаўлёны на векі! Аман. (З твораў сьв. Яна Златавустага).

Божае слова: »Характар чалавека дрэнны ўжо ад маладых гадоў«. (Быцьця 21). »Бо ўсё, што ў сьвеце — пажаданьне цела, пажаданьне вачэй і пыха жыцьця — ня ёсьць ад Айца, але ад гэтага сьвету. (Ян 2, 16). »Мой унутраны чалавек знаходзіць здаваленьне ў законе Божым, але ў членах маіх я бачу другі закон, што змагаецца з законам майго розуму і робіць мяне нявольнікам закону грэху, які ёсьць у членах маіх«. (Рым. 7, 22-25).

Увага: Першародны грэх пакінуў у натуры чалавека сьляды або заганы, якія мы называем галоўнымі грахамі, бо ўсе грахі вырастаюць з гэтых заганаў, як дрэвы з карэньня. Ёсьць іх сем: 1) Пыха, 2) Прагавітасьць або хцівасьць, 3) Нячыстасьць, 4) Гнеў, 5) Абжорства і п'янства, 6) Зайздрасьць, 7) Ляніўства.

24) *Пытаньне да XIV-ай Катэхэзы:*

Як называецца грэх, зь якім мы ўсе прыходзім на сьвет?

Адказ: **грэх, зь якім мы ўсе прыходзім на сьвет, называецца першародным грахом.**

ВЕСТКІ З РЭЛІГІЙНАГА ЖЫЦЬЦЯ

Сьвяты Год 1975

А поўначы перад самымі Калядамі Павал VI аб'явіў юбілей Сьвятога Году 1975-га для Рыму, бо ў паасобных дыяцэзіях ён ужо адбыўся ў 1974 г. Юбілей пачаўся адчыненьнем звыкла замураваных дзьвярэй у базыліцы сьв. Пятра, што з'яўляецца сымбалям крыніцы тых ласкаў, якімі Царква абдароўвывае вернікаў у час Юбілею. З нагоды юбілейнага Году Папа выдаў пасланьне аб паяднаньні чалавека з Богам, якое адбываецца перадусім праз тайну сьв. споведзі, у якой Бог дароўвывае грахі каюшчымуся праз Царкву. У Царкве трэба адрожніць тую Богам устаноўленую інстытуцыю, якае мае ўладу навучаць і асьвячаць і Царкву г. зн. людзей-вернікаў, якія самі ўсьцяж патрабуюць аднаўленьня.

Прадбачваецца, што каля 8 мільёнаў пільгрымаў адведае на працягу Сьвятога Году Рым і гроб сьв. Пятра. Ёсьць пажаданым, каб і беларусы — хто толькі можа — наведалі Рым. У гэтым дапамогуць пражываючыя ў Рыме беларускія сьвятары, зь якімі перш за ўсё трэба навязаць лучнасьць.

Збліжэньне між хрысьціянамі і жыдамі

У мінулым годзе Папа Павал VI заснаваў адумысловую Камісію дзеля палепшаньня адносінаў між каталікамі і міжнародным юдаізмам. Хаця ўжо і існаваў Камітэт з падобнай мэтай пры Сакратар'яце Аб'еднаньня Хрысьціян, але засяг яго аказаўся лішне вузкі. Успомненая Камісія ў хуткім часе выдала пэўныя дырэктывы, каб ажывіць дэкрэт Ватыканскага Сабору. Камісія зьвяртае ўвагу на тое, каб пашыраць больш сярод хрысьціян і жыдоў сьведамасьць аб тым, што іх лучыць, прыкладам: вера ў аднаго Бога, які ёсьць Існасьцю духовай, перавышаючай дасканаласьцю ўсе стварэньні. Хрысьціянская рэлігія ёсьць глыбока і неразрыўна зьвязана з Старым Запаветам. Сам яе заснавальнік ёсьць найвялікшы жыдоўскі прарок Ісус Хрыстос; Ягоная Найсьвятая Маці, Апосталы і большасьць першых хрысьціян паходзілі з жыдоўскага народу. Хрысьціяне і жыды моляцца славамі тых самых псальмаў і гімнаў Ст. Запавету. Таму ёсьць пажаданым наладжываць сустрэчы хрысьціян з жыдамі для ўзаемнага пазнаньня, для супольных студыяў, для помачы адны другім. І такім чынам будуць пашырацца добрыя адносіны і любоў.

Мадзяршчына

У выніку перагавораў між Ватыканам і мадзярскім урадам Папа Павал VI мог назначыць нядаўна пяць новых Біскупаў. Цяпер з 9 дыяцэзіяў яшчэ дзьве ня маюць сваіх пастыраў.

У вольным сьвеце таксама чуваць аб мадзярах, а гэта дзякуючы Кардыналу Я. Мідсэнці, які адведвае розныя асяродкі пасяленьня, падтрымоўвае на духу сваіх вернікаў і гаворыць праўду аб камунізме, ад каторага выцерпеў страшэнныя зьнявагі і мукі. Нядаўна ўбачыў сьвет яго дзёньнік, надрукаваны ў розных мовах. Цікава высказаўся гэты вялікі Дастойнік аб сьвятарах і палітыцы: »Я ўважаю, што палітыка ёсьць злом, неабходным аднак у жыцьці сьвятара. А гэта таму, што палітыка можа вывярнуць аўтар і паставіць у небясьпеку несьмяротныя душы. Я заўсёды быў той думкі, што сьвятар павінен быць добра паінфармаваны ў адрэзку палітыкі партыі«.

Сяньня некаторыя газэты распісваюцца аб гэраізме Кардынала Мідсэнці і стараюцца яго паставіць супроць »ост-палітыкі« Ватыкана. У гэтай дэлікатнай справе за мала нам ведама, каб браць ў абарону адну толькі старану, а другую абвіняць. Рымляне калісь казалі: virtus stat in medio!

Румунія

Зроблены адзін крок наперад: нядаўна прадстаўнік ватыканскай прэсы падаў да ведама, што Апостальскі Пасад наважыўся распачаць перагаворы з урадам румынскім аб ўзаемных адносінах Царквы і дзяржавы. Каталіцкая Царква патрабуе дапамогі, бо ад часу вайны знаходзіцца ў нязвычайна цяжкім паложаньні. Тры лацінскія дыяцэзіі ня маюць сваіх Біскупаў. Царква ўсходняга абраду зьліквідаваная і сіламоц улучаная ў Праваслаўную Царкву, а пяць іхніх Герархаў з пасадаў проста пасаджаныя былі ў турмы і там памёрлі як мучанікі.

Буддысты у Папы Паўла VI

У студні т.г. Папа прыняў на аўдыенцыі Гуальва Кармапа, Старшага аднаго з буддыйскіх кляштараў у Тыбэце. Ён меў з сабой пяць манахаў. Прамаўляючы да іх Папа прыпомніў, што ІІ-гі Ватыканскі Сабор выказаў прызнаньне для буддызму, бо кожная з ягоных формаў дала чалавецтву шмат духовых вартасьцяў. Цяпер сакратарыят для не-хрысьціянаў вядзе працу ў кірунку ўзаемнага пазнаньня. »Кожны прагрэс якойколечы рэлігіі — казаў Папа — нас цешыць, бо прычыняецца да супакою на сьвеце«.

Харызматыкі

У гэтым Святым Годзе ад 16 да 18 траўня, на Зялёныя Сьвяткі, у Рыме мае адбыцца сусьветны Кангрэс харызматыкаў. Што-ж гэта за людзі харызматыкі? Грэцкае слова »харісма« азначае дар, ласку. Таму людзей абдараных пэўнымі ласкамі дзеля выконваньня сваіх абавязкаў у

Хрыстовай Царкве можна назваць харызматыкамі. Прынята аднак у тэалёгіі харызмай называць надзвычайную ласку дадзеную Богам пасобным людзям дзеля дабра іншых. Аб гэтакіх харызматах або ласках няраз пісаў Апостал Павал у сваіх пасланьнях (I Кар. XII; Эф. IV, 11; Рымл. XII, 6-8). — Сяньня вельмі голасна аб харызматыках у Зл. Штатах Амэрыкі. Уважліва сьлядзіць іх Каталіцкая навука і Царква. Папа Павал VI зьвярнуў на іх увагу і пазволіў склікаць у Рыме Кангрэс. Духовым кіраўніком Кангрэсу назначаны бэльгійскі Кардынал Суэнанс, які будучы ў Амэрыцы меў нагоду бліжэй пазнаць харызматыкаў. Прадбачваецца каля 10 тысяч удзельнікаў. Рух гэты гуртуе пераважна маладых людзей энтузыястаў, якія сапраўды шукаюць правядзеньня сьвятога Евангельля ў жыцьцё. Дзеля таго, што не заўсёды можна адрожніць дар надпрыроднай ласкі ад паччуцёвай паталёгічнай палкасьці, Царква вельмі паступае асьцярожна, аднак там дзе справа рэлігіі і душ людзкіх, яна ніколі ня можа адказацца ад абавязку дапамогі людзям і ў патрэбе кіраваньня імі.

ЗЬ БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Айцец Уладзімір Тарасэвіч — Архімандрытам

Рэлігійнае жыцьцё у пасьля-ваенныя часы сярод беларусаў каталікоў значна ажывілася, але на эміграцыі ў неспрыяючых умовах! Апрача розных установаў і часапісаў, паўстала свая ўласная герархія, а як усім добра ведама ў Каталіцкай Царкве гэта ёсьць магчымым толькі пры судзейнасьці Апостальскага Рымскага Пасаду. Успомнім тут галоўныя назначэньні сярод нашага духавенства.

На просьбу беларускіх каталіцкіх сьвятароў у 1952 г. Апостальскі Пасад назначае Я. Д. Біскупа Б. Слосканса Апостальскім Візытатарам беларусаў каталікоў абодвых абрадаў лацінскага і ўсходняга. Заўважым, што Біскуп Слосканс да гэтага часу астаецца Апостальскім Адміністратарам Магілёўскім і Менскім і што ён ужо двух сьвятароў беларусаў новавысьвячаных прыняў у Менскую дыяцэзію. — У 1960 г. Папа Ян XXIII а. Ч. Сіповіча з закону Айцоў Марыянаў назначае Біскупам Марыямітанскім, а ў наступным годзе а. др. П. Татарыновіч атрымоўвае годнасьць Пралата Яго Сьвятасьці. Хутка пасьля гэтага, бо ўжо ў 1962 г. а. Уладзімір Салавей падносіцца да годнасьці Мітрафорнага Протоерэя (Пралата ўсходняга абраду), а ў 1965 а. Леў Гарошка, у тым часе Ігумен Лёнданскага Дому Айцоў Марыянаў, атрымоўвае годнасьць Архімандрыта. Гэту самую годнасьць апошнім часам атрымаў а. Уладзімір Тарасэвіч, з закону Айцоў Бэнэдыктынцаў, пробашч беларускай парахвіі Сьв. Спаса ў Чыкага.

Усё гэта сьведчыць аб прыхільных адносінах Апостальскага Пасаду да дзейнасьці беларускіх сьвятароў, дзе-б яны не знаходзіліся. Тое самае трэба сказаць і аб беларусах каталіках на бацькаўшчыне. І даўно там быў-бы свой беларускі каталіцкі Біскуп, каб не стаяла гэтаму на перашкодзе савецкая блізарукая антырэлігійная палітыка і часьць польскага духавенства, што астаўшыся на Беларусі ў далейшым карыстаецца польскай мовай у касьцёлах і мроіць аб павароце на беларускія землі »моцарствовай« Польшчы. Усё гэта давядзе да таго, што паўстане катакомбная Церква, а кроў мучанікаў станецца насеньнем жывой народнай Хрыстовай Царквы.

Ня маючы рэлігійнай свабоды на бацькаўшчыне мы цешымся таму яшчэ больш на чужыне, калі нашыя духоўныя дзеячы атрымоўваюць заслужаную ўзнагароду.

Годнасьць Архімандрыта для Паважанага Айца Ўладзіміра Тарасэвіча мела быць нададзенай з нагоды 25-цігодзьдзя яго сьвятарства, аднак дзеля паштовага страйку ў Італіі не было змогі заладзіць пэўных патрэбных у гэтым выпадку фармальнасьцяў.

Я. Эм. Кардынал Філіпп, Прэфэкт Кангрэгацыі Ўсходніх Цэркваў, у лісьце да Біскупа Ч. Сіповіча з дня 28 лістапада 1974 г. пісаў, што Ўсходняя Кангрэгацыя ахвотна згадзілася удастоіць а. Ўладзіміра Тарасэвіча годнасьцю Архімандрыта ведаючы яго працу і жадае яму большых яшчэ вынікаў на карысьць душаў сьвятой Божай Царквы.

Галоўная ўрачыстасьць увядзеньня у сан Архімандрыта адбудзецца ў Чыкага ў царкве Сьв. Спаса дня 25 траўня 1975 г.

Найшчырэйшыя пажаданьні дарагому Айцу Ўладзіміру! Шмат год!

Лекцыі беларусаведы

Паводле прынятага пляну акадэмічнага году 1974-75 лекцыі беларусаведы адбываліся ў далейшым у наступным парадку:

Дня 12 сьнежня 1974 г. чытаў лекцыю сп. Г. Пікарда, сакратар Ангельска-Беларускага Таварыства на тэму: »Антон Навіна Луцкевіч (1884-1946) і пераклад на беларускую мову Новага Запавету і Псальмоў — 1931 г.«. Гэты цікавы даклад быў апрацаваны на матар'яле з розных крыніцаў, пераважна ангельскіх дагэтуль нікім нявыкарыстаных. Друкуем яго ў гэтым нумары нашага часапісу ў ангельскай мове.

Дня 13 лютага 1975 г. чытаў чарговую лекцыю а. А. Надсон: »Беларускія старадрукі ў заходніх бібліятэках«. Як дагэтуль ёсьць ведамых больш за 50 беларускіх старадрукаў, якія знаходзяцца ў розных сховішчах сьвету, а якіх ніхто яшчэ належна не апісаў, а калі хто іх і дакранаў, дык падаваў як расейскія ці нават польскія кнігі. Час ужо нам самім заняцца нашай багатай спадчынай, што і робіць а. А. Надсон.

Першы свой даклад для сяброў Ангельска-Беларускага Таварыства дня 19 сакавіка 1975 г. меў сп. Пётра Мэё (Mayo) з унівэрсытэту ў Шэффільд на тэму: »Навейшыя зьмены ў беларускай літаратурнай мове«. Дакладчык ёсьць аўтарам беларускай граматыкі ў ангельскай мове, якая ўжо друкуецца. У сваім дакладзе ён прааналізаваў каля 40 групаў беларускіх назоўнікаў, зьвяртаючы ўвагу перадусім на націск у паасобных словах і на арфаграфію. Незалежна ад розных беларускіх граматыкаў яшчэ ёсьць шмат беларускіх слоў, пра націск якіх або йдзе дыскусія сярод навукоўцаў спэцыялістаў або па рознаму ён стаіць жывым народным выгавары.

Усе даклады адбываліся ў залі школы сьв. Кірылы Тураўскага (39 Гольдэн Роад) а гадз. 7 вечарам і трывалі разам з дыскусіяй каля поўтары гадзіны. Пасьля ўсе прысутныя (каля 25 асоб) мелі пасілак і шклянку віна. Як доўгалетняя практыка сьведчыць, для навукі патрэбна таксама сяброўская атмасфэра.

X-ы Гадавік Журналу Беларускіх Студыяў

Падаём коратка зьмест X-га гадавіка ЖБС за 1974 г., які нядаўна (у месяцы сакавіку) толькі выйшаў з друку, а які можна замовіць пад наступным адрасам: Mr. J. Michaluk, 11 Ridgeview Road, London, N20 0HH.

У гэтым нумары надрукавалі свае працы: Г. Лімінг, »Мова Новага Запавету і Псальмоў выданых у Куцейне ў 1652 г.«. Кніжка гэта знаходзіцца ў бібліятэцы Францішка Скарыны ў Лёндане. — Праф. Шавялёў, »Размяжаваньне тэкстаў беларускіх і украінскіх у пісьменнасьці перад 1569 г.« — А. Б. МакМільлін, »Рымы і мэтрыка беларускага верша XIX ст. Статыстычныя заўвагі«. — П. Мэё, »Адхіленьні ад нормаў беларускага правапісу: замена е праз я у складах пасьля націску«. — Р. Д. Сассэкс, »Спроба фанэтычнага апісаньня беларускай мовы«. — А. Надсон: Выбраная бібліяграфія. — Заўвага аб Обэроне Гэрбэрт, былым Старшыні Ангельска-Беларускага Таварыства. — Рэцэнзыі кніг і беларуская хроніка.

Акадэмія прысьвячаная Юрку Віцьбічу

2 сакавіка г.г. сабраліся беларусы зь Лёндану і ваколіцаў у залю Школы Сьвятога Кірылы Тураўскага (Фінчлі), каб належна ушанаваць памяць нядаўна памёршага пісьменьніка Юркі Віцьбіча. Даклад аб жыцьці і творчасьці пісьменьніка прачытаў Біскуп Ч. Сіповіч, у часе якога сп. сп. Залога і Зданковіч чыталі некаторыя творы Віцьбіча. Таксама прысутныя праслухалі паэму Алеся Салаўя: »Зьвіняць Званы Сьвятой Сафіі« (Зальцбург 1946), прысьвячаную аўтарам Юрку Віцьбічу, а запісаную на магнітафонную стужку рэдакцыяй радыёперадачаў »Свабода« ў мастацкім выкананьні А. Адамовіча і Я. Запрудніка. Акадэмію арганізавала Управа ЗБВБ і кіраваў ёй яго Старшыня сп. Я. Міхалюк.

Часапіс »Званіца«

Ад сьнежня 1974 г. пачаў выходзіць у Лёндане (як апісвае ягоны пад-тытул) царкоўна-грамадзкі часапіс праваслаўных беларусаў у Вялікай Брытаніі пад назовам »Званіца«. Выйшлі ўжо тры нумары. »Сьціплае ратататарнае выданьне« — чытаем у звароце да чытача Нр. 1, с. 2 — ставіць перад сабой далёка ад сьціплых мэты: »На балонках »Званіцы« мы будзем званіць, будзіць, напамінаць аб нашым гістарычным мінулым, а таксама аб сучасных падзеях, якія адбываюцца ў беларускім царкоўным і нацыянальным жыцьці . . . У сваёй выдавецкай дзейнасьці мы будзем старацца крысталізаваць нашыя думкі, захоўваючы чысьціню хрысьціянскай навукі і нацыянальнай ідэі . . .« Няма больш шляхотных прынцыпаў ад тут выказаных. Нажаль, у складаных жыцьцёвых абставінах абараніць іх нялёгка!

Сп. Гай дэ Пікарда — Рыцарам Нацыянальнага Ордару Заслугі Францыі

Француская амбасада ў Лёндане паведаміла лістом з дня 18 сьнежня 1974 г. сп. Гая дэ Пікарда — добра ўсім беларусам ведамага сакратара Ангельска-Беларускага Таварыства і аўтара шматлікіх прац з галіны беларусаведы — што францускі ўрад узнагародзіў яго пачэсным тытулам Рыцара Нацыянальнага Ордэна Заслугі (Chevalier de l'Ordre National du Mérite).

Даручэньне ордану адбылося ў француcкай амбасадзе дня 13 траўня 1975 г. ў прысутнасьці сваякоў, прыяцеляў і знаёмых сп. Пікарды. Ад беларусаў прысутнічаў Біскуп Ч. Сіповіч.

Хаця ўзнагарода сп. Пікарду прызнана за яго дзейнасьць і заслугі для францускага народу, аднак варта запамятаць, што ў яго рэкамандацыі адпаведнымі дзейнікамі была пададзена і яго навуковая дзейнасьць у галіне беларусаведы.

Беларусы, прыяцелі сп. Пікарды, вітаюць яго з прызнаньнем узнагароды і шчыра жадаюць яму посьпехаў у далейшай разнастайнай яго дзейнасьці на карысьць абодвых слаўных народаў францускага і беларускага.

Сьвяткаваньні 25-га Сакавіка

Як кожнага году, гэтак і сёлета, беларусы — раскіданыя па ўсім сьвеце — ўрачыста адзначылі 57-ую гадаўшчыну прагалошаньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Тут успомнім толькі аб урачыстасьцях у Нямеччыне і ў Лёндане.

У *Мюнхэне* сабраліся беларусы дня 9 сакавіка перш у царкве непадалёк ад галоўнай станцыі, а пасьля ў залі. Сьвятую Літургію адправіў Біскуп Ч. Сіповіч у саслужэньні з а. А. Надсонам, у часе якой меў слова да прысутных аб нашых адносінах да Бога, да Бацькаўшчыны і да самога сябе. Па адслужэньні Літургіі ўсе сабраліся на супольны абед. Айцец А. Надсон зрабіў даклад аб стане беларускай бібліятэкі і музэю ў Лёндане. Беларускую грамаду ачоліваў сп. Ул. Бортнік і ён кіраваў імправізаванай праграмай зборкі, якая перапляталася прамовамі і сьпевамі.

У *Лёндане* сьвяткаваньні ладзіў Лёнданскі Аддзел ЗБВБ дня 23 сакавіка ў залі школы Сьв. Кірылы Тураўскага. Кароткую прамову ў анг. мове меў сп. П. Навара. З чужынцаў ушанавалі наша сьвята у сваіх прамовах сп.сп. Рамішвілі (грузін), Трэмбіцкі (паляк), Бабіцкі і Васылэнко (украінцы). Адсьпяваньнем нацыянальнага гімна закончылася афіцыяльная частка урачыстасьці. Хутка усе прысутныя былі запрошаныя на акуратна прыгатаваны пачастунак.

Памёр Базыль Лукашык

Ад Управы Беларускай Грамады ў Штокгольме прышла сумная вестка, што дня 17 савіка 1975 г. памёр Базыль Лукашык і быў пахаваны дня 27 сакавіка у Сустаўсбэргу. Вечны супакой душы нашага суродзіча!

Сучасныя думкі і прыказкі

Без праўды няма свабоды. Страціш праўду, трапіш у няволю грэху, чарта або ворага.

Хто не бароніць свайго права, той яго не варты.

Даражэй вочы ў пары, чым залатыя акуляры.

Мілей ногі, чым панчохі, што не баляць анітрохі.

Пільнуй галавы, то й шапка знайдзецца!

Як жывеш пуста, то ў галаве гарох з капустай.

Часта б'юць па пальцах, каб рукі працавалі.

Маладому вельмі сьмешна, як стары працуе пасьпешна.

Стары, як малое дзіця і лоб разаб'е нехаця.

Баба есьць надта скора, але доўга гавора.

Богу маліся, а працуй — не ляніся.

Як гандлюеш, мей веру. Калі п'еш, дык знай меру.

На дзікі куст не пазірай.

Зямля чужая не сагрэе того, хто любіць родны край. (Р. Крушына).

Чалавек любіць быць крыху пастрашаны.

Калі пачынаюць аб кім дрэнна гаварыць, значыць, што ён старэе.

Дрэнна дзецям вядзецца, калі сям'я разаб'ецца.

Што ў целе душа, то ў сьвеце хрысьціянін. (Аполёгія II стагодзьдзя).

Бог стварыў час, а чалавек пасьпешнасьць. (Ірляндзкае).

Сьвет трымаетцца на чатырох падставах: навукай мудрага, справядлівасьцяй моцнага, адвагай мужнага і малітвай добрага. (Арабская) (А можа і арабскай нафтаю? . . .)

Найбольш часу мае чалавек, які не адкладае на посьле. (Кітайскае).

Няпраўда абляціць паў горада, пакуль праўда абуецца. (Чэскае).

На тры рэчы няма ратунку: на людзкую злосьць з зайздрасьцяй, на бяду зь ляніўствам і на хваробу ў старасьці. (Усходняе).

Голад мацней усялякага гора. (Дантэ).

Няма нічога больш вялічнага і страшнага як маўчаньне галодных.

Першы на твары галоднага памірае нос . . .

З ЖЫЦЦЯ У ЛЯГЕРАХ:

Лягчэй вярблюду прайсьці праз ігольнае вуха, чым 58-ой выйсьці на волю!

Ноч для сну, а дзень для адпачынку. (Прыслоўе блатных).

Яго пасадзілі за »ліцэпреступленіе« — за усьмешку: паказалі яму нешта ў »Праўдзе«, а ён усьміхнуўся.

Перадам кланяйся, бокам глядзі, а задам шчупай.

Прышоўшы ня сумуй, выходзячы не радуйся!

Яму далі тры: адсядзеў пяць і выпусьцілі заўчасна.

Хто ня быў, той пабудзе; а хто быў, той не забудзе.

Сьпіць-сьпіць, але адпачыць няма калі.

ЗЬМЕСТ

Printed by the Ukrainian Publishers Limited 200 Liverpool Rd., London, N1 1LF.